„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 295 (4201)
Чацьвер, 29 кастрыч. 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

ВУЗЬДЗЕНШЧЫНА АДГУКНУЛАСЯ НА ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б

МАБІЛІЗАЦЫЯЙ УСІХ СІЛ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ У ЗАГАТОЎКАХ

На аснове рашучай барацьбы з кулацкімі рвацкімі тэндэнцыямі, шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы адстаючыя раёны павінны выйсьці на перадавыя пазыцыі збожжазагатоўчага фронту

Поўнасьцю выканаць плян загатовак жывёлы

«...На аснове посьпехаў сацыялізму хутка павышаюцца патрэбы рабочай клясы ў прадуктах харчаваньня і тыя патрабаваньні, якія яна прад'яўляе да іх якасьці. Штогодна ў сацыялістычную прамысловасьць уцягваюцца новыя мільёны рабочых. Хутка расьце насельніцтва гарадоў, узьнікаюць новыя гарады вакол шматлікіх індустрыяльных будоўляў... У шырокім маштабе расьце грамадзкае харчаваньне і яшчэ хутчэй—патрэбы ў ім. Для забесьпячэньня ў гэтых умовах снабжэньня працоўных прадуктамі харчаваньня і рашучага паляпшэньня рабочага забесьпячэньня неабходнай неабходнасьцю зьяўляецца карэнная рэканструкцыя існуючых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў мясной і кансэрвай прамысловасьці, на аснове найлепшага злучэньня высокай тэхнікі новых мясакамбінатаў і кансэрвных заводаў з спэцыяльна-арганізаванай вакол іх сельска-гаспадарчай сыр-цовай базай...» (з пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

Так ахарактарызавалі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР значэньне разьвіцьця мясной і кансэрвай прамысловасьці.

У сьвятле высунутых партыяй і саюзнай уладай задач асабліва вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне набывае выкананьне плянаў разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і мясазагатовак.

На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня задач па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, дасягнуты далёкарныя посьпехі ў разгортваньні жывёлагадоўлі, у папаўненьні стад жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, у паляпшэньні забесьпячэньня рабочых цэнтраў мясапрадуктамі.

Аднак патрэбны яшчэ вялікія намаганьні партыі, рабочай клясы, напружаная работа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, каб поўнасьцю вырашыць мясную праблему.

Асаблівая ўвага павінна быць аддана ПОЎНАМУ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЮ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК ЖЫВЁЛЫ. Між тым апошнія зводкі аб ходзе мясазагатовак сыгналізуюць аб прарывах на гэтым важнейшым вучастку рабочага забесьпячэньня.

КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН ЖЫВЁЛАЗАГАТОВАК ПА БССР НА 29-ГА КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 11,2 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 35 ПРОЦ., УСТАНОЎЛЕНЫХ ПЛЯНАМ.

У той час, як Белхлебжыўсаюз выканаў 12,6 проц. квартальнага заданьня, сыстэма спажывецкай кааперацыі загатовіла менш 10 проц. Гэта вынік ня спутнасьці, непрыстасаванасьці пасобных зьвеньняў спажывецкай сыстэмы да разгортваньня загатовак жывёлы.

Рад раёнаў ганебна зьнізіў тэмпы загатовак: Полацкі раён выканаў толькі 2,6 проц. квартальнага плану, Чырвонапольскі—3,8 проц., Хойніцкі—3,9, Тураўскі—4,1 проц. У Пухавіцкім і Клічаўскім раёнах дагэтуль займаюцца апартуністычнай балбатнёй аб нерэальнасьці плянаў загатовак. У Дубровенскім раёне ў загатоўках да апошняга часу панаваў бюракратычны спакой — пляны адпачываюць у канцылярскіх папках, ня гледзячы на выразныя дырэктывы аб давядзеньні іх да нізоўкі.

У Мазырскім, Гомельскім, Хойніцкім і інш. раёнах дагэтуль цьвёрдыя заданьні не даведзены поўнасьцю да кулацка-заможных гаспадарак, ня прынятыя рашучыя меры ў адносінах кулакоў, якія сабатуюць здачу жывёлы. Карыстаючыся патураньнем з боку мясцовых арганізацый, кулацка-заможныя гаспадаркі разбазарваюць, драпежніцкі забіваюць жывёлу. Мясцовым арганізацыі ў Полацкім, Хойніцкім, Рагачоўскім і Жлобінскім раёнах нічога ня робяць для ліквідацыі спэкуляцыі жывёлай, ня прымаюць мер да спыненьня забою. Ёсьць факты, калі пасобныя сельсаветы выдаюць дазвол на забой жывёлы тым гаспадаркам, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Карэньні прарываў—у тым, што ў радзе месц загатоўчы апарат і мясцовыя арганізацыі недацэньваюць палітычнае значэньне кампаніі загатовак жывёлы, не праводзяць масавай работы, не разгарнулі сацпаборніцтва калгасаў і саўгасаў, не арганізавалі грамадзкага буксіру перадавых сельсаветаў і калгасаў над адсталымі, ня робяць рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Там, дзе гэта зроблена, дзе жывёлазагатоўкі ператварыліся ў масавую кампанію, дзе ліквідаваны апартуністычны курс на самацёк, ТАМ плян загатовак чацьвертага кварталу амаль поўнасьцю выкананы.

КАСЬЦЮКОВІЦКІ раён напрыклад, ужо загатовіў 31,8 проц. квартальнага пляну, ТАЛОЧЫНСКІ—26,5 проц.

Гэтыя посьпехі атрыманы дзякуючы ўпартай барацьбе з апартуністычнай практыкай пасобных нізавых зьвеньняў загатоўчай сыстэмы і рашучаму ўдару па кулацкім сабатажы.

Дзе-ні-дзе дагэтуль наглядаюцца МЕСЬНІЦКІЯ НАСТРОІ. У асобных мясцох раённыя арганізацыі разбазарваюць мяса на свае патрэбы, раздаюць нарады, забываючы аб патрабаваньнях рабочых цэнтраў. Месьніцкія настроі павінны быць неадкладна ліквідаваны. Усіх тых, хто ставіць сваю «зважніцу» на першы плян, трэба разглядаць, як праваднікоў кулацка-спажывецкіх тэндэнцый, як работнікаў, што ігнаруюць інтарэсы дзяржавы.

У радзе раёнаў пляны загатовак выконваюцца за пік буйной рагатай жывёлы, загатоўшчыкі забываюць аб ажыцьцяўленьні плянаў на дробнай жывёле і сьвінях. Плян загатовак сьвіней выканан толькі на 3 проц. З гэтым злом у жывёлазагатоўках трэба павесьці бязьлітасную барацьбу.

Яшчэ не нападжан улік загатовак па сэктарах,—у раёнах часта ня ведаюць, колькі жывёлы павінны здаць кулацка-заможныя гаспадаркі, колькі трэба загатовіць у калгасах і саўгасах. Гэта спрыяе кулацкаму сабатажу. Не наладзіўшы ўліку, раёны пазбаўлены магчымасьці хутка рэагаваць на правапартуністычную практыку пасобных нізавых арганізацый.

На мясцох наглядаецца тэндэнцыя практыкаваць ў жывёлазагатоўках некаторыя мэтады загатовак збожжа, без уліку спэцыфічных умоў работы. Ёсьць факты згортваньня прыёмных баз у глыбінных пунктах і канцэнтрацыі іх пры станцыях. Гэта вядзе да лішніх перагонаў жывёлы і страты жывой вагі. Практыка ліквідацыі глыбінных баз павінна быць неадкладна скасавана.

У радзе раёнаў не нападжана плянавае паступленьне жывёлы. З Касьцюковіцкага раёну, напрыклад, паведамляюць, што на станцыі сабралася шмат скаціны пад адкрытым небам, а чыгунка вагонаў не дае.

ВЯЛІКАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ Ў РАБОЧЫМ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ НАБЫВАЕ КАМПЛЕКТАВАНЬНЕ СТАДА КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ І РАЗЬВІЦЬЦЕ АДКОРМАЧНЫХ АПЭРАЦЫЙ, ЯК ДАДАТКОВАЙ КРЫНІЦЫ ЖЫВЁЛАЗАГАТОВАК.

З Бабруйскага і інш. раёнаў сыгналізуюць, што там гэтай справе не аддаецца належнай увагі. Між тым рацыянальная пастаноўка адкорму дае лішнія тысячы тон мяса; гэта пытаньне павінна сустрэць належную ўвагу з боку ўсіх арганізацый.

ВОПЫТ РАДУ РАЁНАЎ ГАВОРЫЦЬ АБ ПОЎНАЙ РЭАЛЬНАСЬЦІ ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК. На аснове сацыялістычных мэтадаў працы і рашучага націску на кулацка-заможныя элемэнты, на аснове разгортваньня масавай работы, раёны могуць і павінны дабіцца поўнага выкананьня плянаў жывёлазагатовак і гэтым самым забясьпечыць стварэньне цьвёрдай базы рабочага забесьпячэньня.

Раўняцца па перадавых

ВУЗДА, 27. (Наш кар.).

На 20 кастрычніка калгасы Вузьдзеншчыны выканалі плян збожжазагатовак на 33,3 проц., аднаасобны сэктар—на 15,7 проц. Цьвёрдыя заданьні спагнаны на 38 проц.

Бульбы калгасы павінны паводле пляну загатовіць 9.500 цэнтнэраў, аднаасобны сэктар—35.385. Загатоўлена-ж калгасамі 3.113, аднаасобным сэктарам—8.554 цэнтнэры. Мясазагатоўкі таксама разгортваюцца слаба. Толькі 27 кастрычніка плян мясазагатовак на чацьверты квартал 1930 году і на будучы год спушчан у сельсаветы.

РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АДГУКНУЛІСЯ НА ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б мабілізацыяй на ліквідацыю прарываў па ўсіх загатоўках. У сельсаветы для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні загатоўчых кампаній выехаў увесь раённы актыў і ўвесь склад раён нага камітэту партыі.

РК КП(б)Б даў дырэктыву ўсім ячэйкам неадкладна правесьці сходы актыву ў сельсаветах і сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў і праверыць выкананьне плянаў загатовак па ўсіх сэктарох.

Пастаўлена задача—ДА 1 ЛІСТАПАДА ДАБІЦЦА КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК. 28 кастрычніка рэдакцыя раённай газэты «КАЛГАСЬНІК ВУЗЬДЗЕНШЧЫНЫ» выпускае спэцыяльны нумар, прысьвечаны загатоўкам.

КАЛГАСЫ СТАЛЬБОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ЗАГАТОВАК І АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ПА ЗАГАТОЎКАХ БУЛЬБЫ, ЗБОЖЖА, ІЛЬНЯНОГА СЕМЯ, СЕНА І САЛОМЫ ДА 14-ай ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ НА ЎСЕ 100ПРОЦ.

КАЛГАСЫ «ЗАРА ЛЕНІНА», ІМЯ БУДЗЕННАГА І ВЁСКІ КУЛІ ЎЖО ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН БУЛЬБАЗАГАТОВАК. Гэтыя-ж калгасы, калгас «Новае жыцьцё» і імя Варашылава абавязаліся не пазьней 1 лістапада поўнасьцю выканаць плян збожжазагатовак.

Разгорнута ўзмоцненая барацьба з кулацкім сабатажам загатовак. У Стальбоўскім сельсавеце дзьве кулацкія гаспадаркі, якія злосна сабатавалі выкананьне цьвёрдых заданьняў, прыцягнуты да судовай адказнасьці. У Слабодка-Пырасаўскім сельсавеце тры кулакі асуджаны за ўпартае супраціўленьне загатоўкам.

М. Л.

УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ

ЛЁЗНА.

Лёзьнянскі раён павінен загатовіць у гэтым годзе 800 тон збожжа. На 20 кастрычніка загатоўлена 337 тон, або 40,2 проц. заданьня.

Раён меў поўную магчымасьць выканаць ужо кастрычніцкі плян. Адставань не тлумачыцца слабым націскам на кулацка-заможныя элемэнты. Ніякага ўліку і кантролю за выкананьнем цьвёрдых заданьняў па здачы збожжа. РВК і загатоўчыя арганізацыі нават не ведаюць, колькі збожжа паступіла па цьвёрдых заданьнях.

Трэба зараз-жа рашуча ўзмацніць тэмпы збожжазагатовак. Раённыя арганізацыі і сельсаветы павінны неадкладна праверыць, як спагняюцца цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных элемэнтаў, і прыцягнуць да адказнасьці тых, якія патураюць кулацтву ў яго супраціўленьні збожжазагатоўкам.

С.

Здача збожжа на элеватары

Па-бальшавіцку біцца за ліквідацыю прарыву

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

Стара-Дароскі раён ганебна цягнецца ў глыбокім тыле збожжазагатовак. На 25 кастрычніка раён выканаў усяго 16,2 проц. гадавога пляну. Пятая пяцідзёўка кастрычніка дала зусім нязначны прырост — 1,4 проц.

Гэта вынік апартуністычнай практыкі раду раённых арганізацый, сельсаветаў і парт'ячэек, якія недацэньваюць вялізарнага палітычнага значэньня збожжазагатоўчай кампаніі, не мабілізавалі масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на сваячасовае выкананьне сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Адступасьць націску на кулацка-заможныя элемэнты прывяла да таго, што выкананьне цьвёрдых заданьняў па збожжы зрываецца. Па радзе сельсаветаў (Жыцінскім, Дражнянскім, Дарагаўскім, Крываносаўскім) кулацка-заможныя элемэнты дагэтуль не здалі яшчэ ні аднаго цэнтнэра збожжа. Рэшта сельсаветаў спагналі па цьвёрдых заданьнях усяго 10-20 проц.

Правая практыка раду сельсаветаў пераплятаецца часта з «левымі» загібамі. Кармазаўскі, Дражненскі і Пасецкі сельсаветы мэханічна разьмеркавалі агульнае заданьне па збожжы на 15-20 проц. гаспадарак. У выніку — цьвёрдыя заданьні ў гэтых сельсаветах былі даведзены да многіх сераднякоў. РК КП(б)Б і РВК выправілі потым дапушчаныя памылкі.

Вельмі дрэнна стаіць справа з выкананьнем кантрактацыйных дагавораў аднаасобным сэктарам. Раённыя арганізацыі і сельсаветы, спадзяючыся выключна на самацёк, не вядуць ніякай масавай работы сярод аднаасобнікаў. Камісіі садзейнасьці збожжазагатоўкам фактычна бязьдзейнічаюць. У выніку кантрактацыйныя дагавары зусім ня выконваюцца.

Рад сельсаветаў дагэтуль фактычна зусім яшчэ ня ўключыліся ў збожжазагатоўкі. Так, Жыцінскі сельсавет выканаў усяго 0,8 проц. свайго заданьня. Пасецкі, Дражненскі, Крываносаўскі і Горкаўскі — ад 6 да 8 проц. заданьня.

Апартуністы з гэтых сельсаветаў тлумачаць адставаньне «аб'ектыўнымі прычынамі». На справе-ж за шырмай «аб'ектыўных прычын» хаваецца злачынная бязьдзейнасьць сельсаветаў і загатоўчых органаў. Старшыня Горкаўскага сельсавету Рухаевец, Жыцінскага — Корсак і Дражнянскага — Заяц лічаць збожжазагатоўкі другараднай справай і заяўляюць: «Спачатку скончым капаць бульбу, а потым возьмемся за збожжазагатоўкі».

Недапушчальна адстаюць і калгасы. Апошнія выканалі толькі 26 проц. свайго заданьня. У некаторых калгасах наглядаюцца рвацкія тэндэнцыі — вынік уплыву кулака.

Праўленьне калгасу імя Войнава 2 кастрычніка вынесла пастанову: «Выканаўшую ранней таварную прадукцыю для дзяржавы разьмеркаваць сяро-калгасьнікаў». Праўленьні калгасаў «Герой працы» і «Скварцоў-Маёраў», каб утаіць лішкі збожжа, штучна зьмянчылі ўраджай і пры складаньні карманых балянсаў улічылі толькі па 12 пудоў аўса і 300 пудоў бульбы з гектара. Праўленьне калгасу «Х.-годзьзьзе» ўлічыла толькі 500 пудоў бульбы з гектара, а пры праверцы на месцы аказалася, што зьнята 800-900 пудоў бульбы з гектара. Гэтым рвацкім, кулацкім тэндэнцыям ня было дана рашучага адпору.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі вельмі дрэнна кіруюць сваёй нізоўкай і ня цікавяцца, як стаіць справа са збожжазагатоўкамі па асобных сельскіх спажыўтаварыствах. Між тым, многія спажыўтаварыствы на мясцох разам з казапупаўкаважанымі ліквідальнікамі бязьдзейнічаюць. Старшыня Шчытаўскага сельспажыўтаварыства Аксенчык у справаздачным дакладзе на прэзыдыуме сельсавету адкрыта заявіў: «Мы на збожжазагатоўках нічога не зрабілі і рабіць ня зьбіраемся». І гэты махровы апартуніст, кулацкі агент дагэтуль яшчэ ня зьнят з работы і спакойна ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду, зрывае загатоўкі.

25-26 кастрычніка адбыўся пашыраны пленум РВК, які адзначыў недапушчальна слабы ход збожжазагатовак і катэгарычна асудзіў правапартуністычную практыку пасобных сельсаветаў і ўпаўнаважаных РВК. Пленум прапанаваў прэзыдыуму РВК неадкладна ўжыць рашучыя меры ў адносінах да канкрэтных посьбітаў зла і зрыўшчыкаў загатовак. Пленум мабілізаваўся на рашучую барацьбу з кулацкім спажывецкімі тэндэнцыямі ў калгасах на забесьпячэньне поўнага і сваячасовага выкананьня пляну збожжазагатовак.

Раённыя арганізацыі, сельсаветы праўленьні калгасаў, раўняючыся па перадавых, павінны ў бліжэйшы час даказаць на практычнай рабоце, што яны сапраўды па-бальшавіцку здольны змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)В і СНК. Трэба ўсёй бязьлітаснасьцю ўдарыць на правым і «левым» апартунізьме, разгарнуць шырокую масава-палітычную работу вакол збожжазагатовак, рашучна націснуць на кулацка-заможныя элемэнты. Да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі Стара-Дароскі раён павінен выйсьці з глыбокага тылу на перадавыя пазыцыі збожжазагатоўчага кампаніі.

Брыгадзір «Зьвязды» ВАЎЧКОЎ.

175000 тон бульбы Ленінграду

КРЫВУЮ АДГРУЗКІ КРУТА УЗЬНЯЦЬ УВЕРХ

Замест 10.000 тон у дзень адгружаецца толькі 2.600-2.800 тон

РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТУРЫ

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Слуцкі райспажыўсаюз ганебна зрывае загатоўку і адгрузку бульбы пралетарскім цэнтрам. Паводле пляну РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ ПАВІНЕН ДА 1-га ЛІСТАПАДА ЗАГАТОВІЦЬ І АДГРУЗІЦЬ ЛЕНІНГРАДУ 3.764 ТОНЫ БУЛЬБЫ. На 20 кастрычніка ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ 48 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. Прычым ТЭМПЫ загатовак і адгрузкі з кожнай пяцідзёўкай ЗНІЖАЮЦЦА. За пяцідзёўку з 10 да 15 кастрычніка загатоўлена 517 тон бульбы, а з 15 па 20 кастрычніка — толькі 417 тон. За чатыры дні з 19 да 23 кастрычніка ЗАГАТОЎЛЕНА ЯШЧЭ МЕНШ — 175 тон.

У выніку такіх марудных тэмпаў загатовак НА СТАНЦЫІ СЛУЦАК ЧАСТА НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ВАГОНЫ, якія падаюцца для адгрузкі бульбы.

Загатоўчыя арганізацыі праяўляюць поўную бездакназнасьць у важнейшай кампаніі. Яны ня ўлічваюць, што пакуль не наступілі халады, адгрузка бульбы павінна ісьці асабліва ўзмоцненымі тэмпамі, паколькі не патрабуецца дадатковых затрат на ацяпленьне вагонаў.

Недапушчальна адстаюць у загатоўках бульбы калгасы Случчыны. На 20 кастрычніка яны выканалі сваё заданьне толькі на 3,2 проц. У некаторых калгасах рэакцыя інтарэсы процістаяцца агульным інтарэсам пралетарскай дзяржавы. Так, у калгасе ГУТНІЦКАЕ, Старасканга сельсавету, праўленьне зусім сабатуе загатоўкі. Калгас да гэтага часу ня здаў яшчэ дзяржаве ні аднаго цэнтнэра ні збожжа, ні бульбы. Бульбу, яшчэ ня ўбраную з поля, падзялілі паміж калгасьнікамі. Тое-ж зрабілі і з ільном. Такавы выхікі злачыннай дзейнасьці праўленьня калгасу, якое падпала пад уплыў клясавага ворага.

У калгас «РУХАВІК», Сяраскага сельсавету, таксама прапезьні кулакі, якія агітуюць калгасьнікаў супроць здачы прадукцыі дзяржаве.

Калгас «В.-БЕЛАРУСЬ» павінен здаць 1.700 цэнтнэраў бульбы, а на сёнешні дзень на здача яшчэ ні аднаго цэнтнэра. Праўленьне калгасу абвясьціла заданьне... нерэальным і адмовілася выканаць яго.

Райкалгасаюз зусім слаба змагаецца з кулацкімі, рвацкімі тэндэнцыямі некаторых калгасаў, не вядзе масавай работы сярод калгасьнікаў, не мабілізуе іх на поўнае і сваячасовае выкананьне плянаў загатовак.

Пасобныя адказныя работнікі імкнуцца апраўдаць слабыя тэмпы бульбазагатовак тым, нібыта бульба яшчэ знаходзіцца ў зямлі. Гэта нельга назваць інакш, як махровым апартунізмам, злосным ашуканствам партыі і рабочай клясы. Плян уборкі бульбы па раёне выканан ужо на 88 проц. Справа ў тым, што бульба, замест вывазкі на чыгуначную станцыю, развозіцца па хавальнях для забесьпячэньня ў першую чаргу сваіх месьніцкіх патрэб.

Паколькі слабы націск на кулацка-заможныя элемэнты, сьведчыць той факт, што ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ ПА БУЛЬБЕ СПАГНАНЫ ЎСЯГО НА 19 ПРОЦ. Раённыя арганізацыі і сельсаветы ня прыцягваюць да адказнасьці кулакоў і заможнікаў, якія злосна сабатуюць здачу бульбы дзяржаве. Ніякага кантролю за выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі няма.

Партыйныя ячэйкі на мясцох у значнай частцы не мабілізаваліся на сваячасовае выкананьне плянаў загатовак і адгрузкі бульбы.

Кіруючыя раённыя арганізацыі абавязаны зараз-жа ўжыць меры да забесьпячэньня рашучага пералому ў ходзе загатовак і адгрузкі бульбы. Крывая загатовак і адгрузкі павінна быць крута ўзьнята ўверх. Трэба даць руйнуючы адпор кулаку і яго агентуры. Трэба бязьлітасна націснуць на кулацка-заможныя элемэнты, прымусіць іх неадкладна і поўнасьцю выканаць цьвёрдыя заданьні. Кулацкія спажывецкія тэндэнцыі павінны быць выкарчаваны. Случчына можа і павінна сваячасова выканаць свае абавязкі перад пралетарскімі цэнтрамі.

Л. ХАЎКІН.

Крычаў адгрузіў 1000 тон

КРЫЧАЎ. (Па тэлетрафу).

Плян адгрузкі бульбы Ленінграду Крычаўскім раёнам выканан з перавышэньнем. Усяго адгружана 1.000 тон.

Сакратар РК КП(б)Б Рындзіч.
Старшыня РВК Лаўрэнаў.

Кулацкія агенты зрываюць загатоўкі бульбы

РАГАЧОЎ.

Вёска Сляпяжаўка, Сьвяцкага сельсавету, павінна здаць па кантрактацыі 800 цэнтнэраў бульбы і ў парадку загатовак 505 цэнтнэраў. Аднак, на 20 кастрычніка вёска ня выканала яшчэ ні заданьня па загатоўках, ні кантрактацыйных дагавораў.

Пасобныя члены сельсавету падпалі пад кулацкі ўплыў і агітуюць разам з кулакамі супроць здачы бульбы дзяржаве. Член сельсавету Нікапаеў сарваў пасяджэньне камісіі садзейнасьці загатоўкам і адгрузцы бульбы, выступіўшы супроць выкананьня заданьня. Яго падтрымаў член сельсавету Архіпенка Марута.

Трэба моцна ўдарыць па кулацкай агентуры, якая імкнецца сарваць загатоўкі. Трэба выгнаць з сельсавету такіх «актывістаў», як Архіпенка і Нікалаеў, якія дапамагаюць кулаку.

Я. К.

126 проц.

БЯРЭЗІНА.

Заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду Бярэзінскім раёнам выканана на 126 проц. Усяго адгружана 1.000 тон замест 792, вызначаных пляном.

Сакратар райкому КП(б)Б СЛАВІН
Старшыня РВК СТРОМ.
Райснаб ХІНЕВІЧ.

Сыстэма райкалгасаюзу адстае

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Магілеўскі раён заканчвае ўборку бульбы. Аднаасобны сэктар ужо поўнасьцю скончыў уборку, сацыялістычны сэктар убраў 99,2 проц. засеянай плошчы.

Сыстэма райспажыўсаюзу выканала сваё заданьне па адгрузцы бульбы на 121,1 проц. — замест 2.200 тон адгружана 2.675 тон. Адстае сыстэма райкаапсаюзу, якая з 1.000 тон, вызначаных пляном, адгрузіла ўсяго 490 тон, або 49,9 проц.

Па раёне разгортваецца перавораньне плошчы з-пад бульбы ў другі раз. Калгасы і аднаасобнікі Бялевіцкага, Вендароскага, Вышаўскага, Грабляўскага, Палыкавіцкага, Сялецкага, Хонаўскага Таранаўскага, Мастоцкага і Чарназемаўскага сельсаветаў ужо скончылі гэту работу.

Ул. МАРСКІ.

Пытаньні рабочага забесьпячэньня

ЗРАБІЦЬ СТРЫЖНЯВЫМІ У РАБОЦЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПОБАЧ З ПЫТАНЬНЯМІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Аб рабочым забесьпячэньні

рэзалюцыя агульна-гарадзкога сходу партыйнага актыву па дакладах т. т. Балціна і Хаскіна

Заслухаўшы даклады т.т. Балціна і Хаскіна аб рабочым забесьпячэньні, сход партыйнага актыву гор. Менску адзначае, што ў выніку ўзмацненьня кіраўніцтва і ўвагі парт. арганізацыі справе рабочага забесьпячэньня дасягнуты некаторыя посьпехі ў гэтай галіне (забесьпячэньне гародніной, пашырэньне ахопу рабочых грамадзкім харчаваньнем, паляпшэньне абслугоўваньня рабочых праз Б. Ц.).

Аднак, карэннага паляпшэньня ў рабочым забесьпячэньні не дасягнута. Асабліва слаба выконваюцца дырэктывы партыі ў галіне паляпшэньня якасьці грамадзкага харчаваньня.

Сход партыйнага актыву знаходзіць, што спажывецкая кааперацыя да гэтага часу не скарыстала ўсіх магчымасьцяй у галіне арганізацыі і паскарэньня таваразвароту. Гэта тлумачыцца галоўным чынам тым, што ўся сыстэма спажывецкай кааперацыі яшчэ належным чынам не перабудавала сваёй работы на падставе 6-ці ўмоў тав. Сталіна і адозвы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу ад 12-га мая г. г. і шчэ ня ўсе парт. арганізацыі пасталілі пытаньне рабочага спажываньня ў цэнтры сваёй увагі.

Важнейшай задачай усіх кааперацыйных арганізацый зьяўляецца паскарэньне і павялічэньне таваразвароту шляхам пляніраваньня загатовак, вышуканьня мясцовых рэсурсаў, скарыстаньня самаматужных вырабаў і г. д. Сход парт. актыву патрабуе ад усіх кааперацыйных арганізацый поўнага выкананьня плянаў таваразвароту. Парт. органам паставіць плян выкананьня таваразвароту, як адну з галавых задач.

Адзначаючы, што паляпшэньне рабочага спажываньня зьяўляецца адным з важнейшых фактараў забясьпечваючых выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, парт. актыў знаходзіць паляпшэньне валіких магчымасьцяй у справе павялічэньня фондаў спажываньня праз самазагатоўкі, ухваляючы пастанову бюро гаркому па гэтым пытаньні, сход парт. актыву лічыць, што важнейшая задачай усіх партыйных, прафесыянальных, гаспадарчых, кааперацыйных арганізацый, асабліва ЗРК, ЗВК, ТПО і ЦРК, сьвядомага арганізацыя далатковых загатовак. Гэта задача павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсёй сыстэмы спажывецкай кааперацыі. Сход партыйнага актыву рашуча перасьцерагае супроць практыкі простага тавараабмену, які меў месца ў апошні час з боку ряду гаспадарчых арганізацый. Гэта грубае апартуністычнае выкрыўленьне ўстаноўленых партыяй прынцыпаў гаспадарчага разрахунку вядзе да зрыву ўстаноўленых урадам пляноў таварнага і прамысловага снабжэньня і поўнай дэзарганізацыі снабжэнчай работы.

Сход партактыву лічыць таксама абсалютна недапушчальнымі факты самавольнага скарыстаньня сваёй прадукцыі прадпрыемствамі для снабжэньня рабочых свайго прадпрыемства. Гэта апартуністычная практыка самаснабжэньня «дэзарганізуе вытворчасьць, затрудняе выкананьне агульна-дзяржаўных пляняў і ўносіць элемэнты разлажэньня ў асобныя групы рабочых» («Правда» ад 25-Х).

Адной з важнейшых задач усіх кааперацыйных, партыйных і гаспадарчых арганізацый прадпрыемстваў зьяўляецца найбольш шырокае разгортваньне адкормачных апэрацый. Разгортваньне адкорму зьяўляецца важнейшым сродкам паляпшэньня грамадзкага харчаваньня і рабочага снабжэньня і па ступені выкананьня гэтага і павінна вызначацца якасьць работы кожнай кааперацыйнай арганізацыі, кожнага ЗРК.

Сход партыйнага актыву прапануе:

1. Усім ЗРК безадкладна прыступіць да самастойнай загатоўкі сьвіней, Наркамснабу і Белкаапсаюзу неадкладна вырашыць пытаньне аб парадку гэтых загатовак.

2. Фракцыям ЗРК, ЦРК і ТПО заразжа разгарнуць работу па самастойных загатоўках птушкі, яек, масла, грыбоў і гародніны.

3. Партарганізацыям, фракцыі гарсавету і гарпрафсавету ўзяць пад асобны кантроль работу ЗРК, ЦРК і ТПО, забясьпечыўшы штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва работай па сапраўдным разгортваньні самастойных загатовак гэтымі арганізацыямі, праяўленьні імі гаспадарчай ініцыятывы, правільным скарыстаньні прадуктаў харчаваньня мабілізацыі вакол гэтага ўсю рабочую грамадзкасьць.

4. Сход партыйнага актыву з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае выключнае значэньне выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В па грамадзкім харчаваньні і патрабуе ад усіх кааперацыйных, партыйных і гаспадарчых арганізацый дабіцца рашучага паляпшэньня ў рабоце сталовак шляхам самай шырокай арганізацыі адкормачных апэрацый, стварэньня пасобных прадпрыемстваў па птушніцтве, трусагадоўлі і г. д., паляпшэньня санітарнага становішча, увядзеньня паблюднай сыстэмы, гаспадарчага разрахунку і зьдзельшчыны, поўнасьцю ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК аб правах загадчыкаў сталовых і арганізацыі сталовымі самастойных заданьняў.

5. Партактыў знаходзіць абсалютна недапушчальнымі тэмпы загатовак, незабясьпечваючымі выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад КП(б)Б. Партактыў цалкам ухваляе пастанову ЦК КП(б)В па пытаньні аб загатоўках, якая наносіць руйнуючы ўдар па апартуністах, зрываючых важнейшыя гаспадарча-палітычныя задачы партыі. Адзначаючы рэальнасьць памечаных партыяй пляноў загатовак, партактыў патрабуе ад усіх арганізацый разгортваньня такіх тэмпаў загатовак, якія-б забясьпечылі поўнае і сваячасовае выкананьне памечаных пляноў.

6. Сход партактыву знаходзіць, што да гэтага часу не дасягнуты рашаючыя зрухі ў пастаноўцы партыйна-масавай работы ў кааперацыі. Партактыў рашуча патрабуе паляпшэньня пастаноўкі партыйна-масавай работы ў кааперацыі, галоўным чынам па лініі арганізацыі і ўзмацненьня нізавых партыйных арганізацый (парт. ячэйка, парт. група). Імен на гэта павінна стаць асноўным зьвяном і павінна гарантаваць здавальняючую пастаноўку работы ў магазыне, сталоўцы і ЗРК.

Т. Бедзьны — ударнік матарыст.

АБ "СОЮЗСАХАРЕ"

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25-га кастрычніка 1931 г.

1. Заслухаўшы даклад камісіі па праверцы дзеяньняў «Союзсахара» ў галіне збожжаздачы па 44 камбінатах, ЦК канстатуе:

1. У саўгасах «Союзсахара» ўстаноўлена масавае ўтойваньне ад дзяржавы таварнага збожжа:

а) ва ўсіх праверэных саўгасах мала месца злоснае перапамяншэньне фактычнай ураджайнасьці, а значыць і палавых зборaў;

б) шляхам сьпісваньня ў адходы і сьвядома нядобраякаснага абмолоту захавана значная колькасьць годнага для спажываньня збожжа;

г) у радзе саўгасаў значная колькасьць збожжа (каля тысячы цэнтнэраў на саўгас) не запрыходавана і тым самым пакінута ў бескантрольным карыстаньні адміністрацыі саўгасаў.

2) Побач з наўмысным зьніжэньнем збожжавых рэсурсаў у саўгасах «Союзсахара» ўстаноўлена значнае перапавялічэньне (у паўтары-два разы) харчовых, фуражных і насенных фондаў, якое мяжуецца ў радзе выпадкаў з простым машэньництвам:

а) патрэбнасьць у рабочай сіле перапавялічвалася ў 1 з пал.—2 разы супроць сапраўды неабходнай;

б) нормы забесьпячэньня людзей перавышалі ўстаноўленыя законам;

в) колькасьць членаў сем'яў рабочых служачых, пералічаных пры складаньні збожжафуражнага балянсу, перавышала ў 2-3 разы фактычную наяўнасьць;

г)

Вагон можа і павінен працаваць 8 гадзін у суткі

Таварныя двары ў Менску і Жлобіне—могілкі нявыкупленых грузаў

ЗА ПЕРШУЮ ДЭКАДУ КАСТРЫЧНІКА ПА ЧЫГУНКАХ БССР БЫЛО ЗАТРЫМАНА ПАД ВЫГРУЗКАЙ 2.580 ВАГОНАЎ

Пакончыць са злачынна-нядбайнымі адносінамі да вагоннага парку

Партыя паставіла перад чыгуначным транспартам баявую задачу, КАБ НА ПРАЦЯГУ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК ПАВЫСІЦЬ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦЬ ЭКСПЛУАТАЦЫІ ВАГОННАГА ПАРКУ ЯК МЕНШ, ЯК НА АДНУ ГАДЗІНУ Ў СУТКІ.

У выкананьні гэтай дырэктывы павінны значную ролю адыграць ТАВАРНЫЯ ДВАРЫ, ад якіх галоўным чынам зараз залежыць скарачэньне да мінімуму тэрміну прастою вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай. Між тым, трэба адзначыць, што «трыкутнікі» таварных двароў да гэтага часу яшчэ не мабілізавалі ўвагу ўсіх рабочых на выкананьне баявога загаду партыі.

Толькі гэтым можна вытлумачыць такое ганебнае становішча, што ў першай дэкадзе кастрычніка, які зьяўляецца ўдарным месяцам асенньга-зімовых перавозак па чыгунках БССР, заставаліся нявыгружанымі па 260 вагонаў у суткі.

На працягу першай дэкады кастрычніка ВІЦЕБСКІ раён затрымаў пад выгрузкай 1.070 вагонаў, Аршанскі раён—760 вагонаў, Жлобінскі раён — 520 вагонаў і Гомельскі раён — 230 вагонаў.

План пагрузкі вагонаў таксама ня выканан. Па Гомельскім раёне пляны пагрузкі выкананы на 56,1 проц., а па Аршанскім раёне — на 96%. Толькі па ВІЦЕБСКІМ і ЖЛОБІНСКІМ раёнах пляны пагрузкі ў першай дэкадзе кастрычніка былі выкананы поўнасьцю.

Рэйды брыгад «ЗЬВЯЗДЫ» на таварныя двары ст. МЕНСК і ЖЛОБІН, якія адбыліся 22 кастрычніка г. г., выявілі, што таварныя двары фактычна зьяўляюцца «МОГІЛКАМІ», якія хаваюць месяцамі нявыкупленыя грузы і на сотні гадзін затрымліваюць вагоны.

Асноўныя прычыны такога ганебнага становішча хаваюцца ў тым, што кіраўнікі таварнага двара САЮЗТРАНСУ і таварнай станцыі ня прынялі рашучых захадаў да арганізацыі і бесьперабойнай выгрузкі і пагрузкі грузаў. Ні адзін пункт з загаду тав. АНДРЭЕВА аб арганізацыі пагрузчна-разгрузчных работ яшчэ ня выканан. Кіраўнікі гэтых аддзілак спадзяюцца на самацёк. Замест таго, каб прыступіць да безадкладнай рэалізацыі п. 5 загаду тав. АНДРЭЕВА, кіраўнікі таварнай станцыі і Саюзтрансу дадумаліся перадаць гэты пункт на разгляд менскага гарсавету, каб апошні вынес пастанову — ці матэрыяльна, каб упасьнікі самі разгружалі і пагружалі свае грузы.

Дырэктыва ЦК чыгуначнікаў аб прыраўненьні ў забесьпячэньні грузчыкаў да чыгуначнікаў, таксама ня выканана. Грамадзкае харчаваньне на таварных дворах станцыі Менск і Саюзтрансу для грузчыкаў не наладжана. Усё гэта вельмі адбіваецца на падняцьці прадукцыйнасьці працы грузчыкаў, якія працуюць на таварных дворах.

Практыка шырокага продажу грузаў, якія не выкупляюцца ва ўстаноўленыя тэрміны, ня ўжываецца і ў выніку гэтага затаварваньне пакгаузаў павялічваецца.

Трыкутнікі таварных двароў павінны безадкладна зьнішчыць усе выяўленыя брыгадамі «Зьвязды» недахопы. Апартуністычнай стаўцы на самацёк павінен быць нанесен руйнуючы ўдар.

Трэба памятаць, што барацьба за разгрузку таварных двароў чыгунак БССР, барацьба за зьмяншэньне прастояў вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай можа быць з посьпехам праведзена ў жыцьцё толькі ў тым выпадку, калі «трыкутнікі» змогуць зараз-жа мабілізаваць усю рабочую масу на баявое і безадкладнае ажыцьцяўленьне загаду тав. АНДРЭЕВА.

БАРАЦЬБА ЗА ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ КАРЫСНАЙ РАБОТЫ ВАГОННАГА ПАРКУ ЁСЬЦЬ БАРАЦЬБА ЗА ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК.

Таму кожны грузчык, кожны працаўнік таварнага двара і кожны чыгуначнік БССР абязаны ведаць, што яго работа павінна быць накіравана на ажыцьцяўленьне баявой задачы, каб «ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ У ЧАЦЬВЕРТЫМ КВАРТАЛЕ СЯРЭДНЯСУТАЧНАЯ РАБОТЫ ВАГОНАЎ У РУХУ НЯ МЕНШ 8 ГАДЗІН СУПРОЦЬ 6,8 ГАДЗІН У ДАНЫ МОМАНТ І ПА ЦЫСТЭРНАХ НЯ МЕНШ 11 ГАДЗІН» (з загаду НКШЗ). Вагон можа і павінен працаваць ня менш, як 8 гадзін у суткі.

Вагоны стаяць неразгружанымі

Кіраўніцтва Саюзтрансу і Менскай таварнай станцыі ў адносінах выкананьня загаду тав. Андрэева праяўляюць поўную бязьдзейнасьць. Адным з асноўных прычын дрэннай работы вагоннага парку зьяўляецца празьмерная прастой вагонаў. За адных толькі 20 дзён кастрычніка прастой вагонаў у сярэднім складае 26 проц. Ёсьць выпадкі, калі 40-50% вагонаў стаяць неразгружанымі па цэлых сутках. Напрыклад, 13/X на працягу цэлых сутак стаялі неразгружанымі 34 вагоны, 14/X — 59 вагонаў, 15/X — 59 вагонаў, 16/X — 24 вагоны, 17/X — 18 вагонаў і так амаль кожны дзень.

Яшчэ горш стаіць справа з залежамі ўжо выгружаных грузаў. У гэтым пытаньні вінаваты ў першую чаргу самі ўладнікі грузаў. Ёсьць выпадкі, калі грузы валяюцца на таварным двары каля паўгода, прыходзяць у негоднасьць і ніхто на гэта не зьвяртае ніякай увагі. Вось некалькі характэрных фактаў: вагон бярвеньняў, які прыбыў у адрас ДШК, валяецца больш 6 месяцаў. Два вагоны бярвеньняў для дасьледчага інстытуту таксама ляжаць больш месяца. Наогул грузы на дварэ Саюзтрансу, як правіла, ляжаць ня менш 2-х тыдняў. Пакгаузы таварнага двара ст. Менск таксама перапоўнены залежанымі таварамі.

Больш, як 15 дзён на таварным дворы ляжыць нявывезеных 45-50 вагонаў дроў, якія належаць вучастковаму інжынэру Ваенведу. Па патрабаваньні саўгасаў «Вішнеўка» і «Чырвоны каапэратар» прывезьлі тры вагоны штучнага ўгнаеньня, але саўгасы зараз зусім адмаўляюцца выкупляць гэтыя грузы, матывуючы тым, што прывезенае ўгнаеньне не падыходзіць да іхняй глебы. Гэтыя вагоны стаяць нявыгружанымі ўжо больш за два тыдні.

Ёсьць шмат грузаў, якія валяюцца на дварэ і ў пакгаўзах толькі таму, што невядомы іх адрасаты. Напрыклад, больш трох месяцаў у пакгаузе ляжаць: бульба-сажалка, 7 скрынак разабраных с.-г. машын, 2 зьвязкі скуры і цэлы рад іншых грузаў, на якія няма ніякіх дакумантаў і Саюзтранс ня ведае, куды іх дзець. Саюзтранс не выкарыстоўвае сваіх правоў продажу з таргоў нявыкупленых кліентурай грузаў.

Кіраўнікі таварнай станцыі некалькі разоў практыкавалі продаж з таргоў грузаў тых кліентаў, якія ня выкуплялі іх своечасова, але гэта толькі «спробы».

Ня гледзячы на тое, што ў пагрузцы і разгрузках ёсьць вялікія прарывы, Саюзтранс і таварная станцыя ня ўжываюць ніякіх захадаў для пераводу таварных двароў на кругласутачную работу.

У галіне арганізацыі працы грузчыкаў і інш. рабочых Саюзтрансам і таварнай станцыяй таксама мала што зроблена. Праўда, фармальна ўсе грузчыкі ахоплены сацспаборніцтвам, але выкананьне сацдагавору ідзе надта марудна. Амаль усе брыгады грузчыкаў ня выконваюць сваіх норм выпрацоўкі. Прэміі за скарачэньне ўстаноўленых тэрмінаў разгрузкі і пагрузкі вагонаў яшчэ да гэтага часу не ўстаноўлены. Кіраўніцтва таварнага двара дагэтуль не разумее сутнасьці гаспадарчага разрахунку. Зьдзеньчыну і прэміяльна-прагрэсіўную аплату працы так. Васіленка — загадчык дому грузчыкаў — лічыць за гаспадарчы разрахунак.

Пастанова ЦК чыгуначнікаў, каб прыраўняць грузчыкаў па скабжэньні да чыгуначнікаў, ня выконваецца. Грузчыкі атрымліваюць прадукты і тавары так, як атрымлівалі і раней. Грамадзкае харчаваньне для грузчыкаў зусім адсутнічае. На таварным дварэ няма памяшканьня для збору грузчыкаў у часе выхаду на працу.

Загад тав. Андрэева да гэтага часу яшчэ не прапрацован. Нам. заг. Саюзтрансу тав. Картаўцоў заявіў: «Загад тав. Андрэева Саюзтрансу зусім не датычыцца».

Брыгада «Зьвязды»:
ФРОЛАЎ, РЫЎЦЮХ, РАФАНОВІЧ, ДУКОРСКІ і РОЛЬБЕН.

Уборачныя машыны на складах

Кліентура ігнаруе дырэктыву ўраду аб выкупе грузаў не пазьней, як праз 5 дзён. Таварны двор станцыі Жлобін прадстаўляе сабой могілкі грузаў і нават самых тэрміновых, у тым ліку ўборачных і пасеўных.

Вось факты. У самы разгар уборачнай кампаніі з 13 кастрычніка ляжаць пад адкрытым небам і іржавеюць 8 бульбачапалак. Жлобінскае аддзяленьне Белсельгасснабу ўпарта іх ня выкупляе. Дзьве ільнамялкі для райкаапсаюзу стаяць з 16 верасьня, адна капустарэзка для калгасу «Чырвоны Жлобін» — з 26 верасьня. РайГОТ, якое знаходзіцца над бокам таварнага двара, марынавала там стульля з 2 па 12 кастрычніка.

Па нармальнай рабоце таварнага двара ўе паток бездакумантных грузаў. З 31 верасьня ляжаць без руху 197 мяхоў касьцяной мукі, якая прыбыла з Ленінграду без указаньня адрасата. Як бездакумантныя грузы прыбылі з Ленінграду тры вагоны з пячэньнем і іншымі тавамі. Дняпра-Дзьвінскае пароходства ашуканствам атрымала з таварнага двара грузаў на 7.000 руб., але грошай чыгунцы не перавяла.

Жлобінскі вузел часта па сваёй віне зрывае плянавыя перавозкі. Так, у другой дэкадзе кастрычніка служба эксплёатацыі Жлобінскага раёну падала лесправмагасу пад плянавыя перавозкі 5 вагонаў замест 29. Гэтым самым план адгрузкі лесаматар'ялаў сарваны.

Справамі таварнага двара і адносінамі кліентуры да выкананьня дырэктыў ураду аб своечасовым выкупе грузаў павінны зацікавіцца адпаведныя органы.

Брыгада «Зьвязды» і «Ударніка»:
КІН, СУДЗЬБІНА, ПАШКОЎСКІ, ХАЙКІН.

Дровы—Менску

100 вагонаў

штодзенна—ня менш!

Сканцэнтраваць усю ўвагу на выкананьні гэтай задачы

700 ВАГОНАЎ ЧАКАЮЦЬ АДГРУЗКІ

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ВЫРАЗНЫЯ ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б і СНК АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ МЕНСКУ ДРЫВАМІ, ХОД АДГРУЗКІ ДРОЎ З ПРЫМАЦАВАНЫХ ДА МЕНСКУ ЛЕСПРАМГАСАЎ НЕ ПАЛЕПШЫЎСЯ.

ПАВОДЛЕ ДЫРЭКТЫВЫ ШТОДЗЕННА Ў МЕНСК ПАВІННА ПРЫБЫВАЦЬ 100 ВАГОНАЎ. МІЖ ТЫМ ПРЫБЫВАЕ ЗНАЧНА МЕНШ, ШТО СТВАРАЕ ПАГРОЗУ ПЕРАБОЯЎ У ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ПРАЦОЎНЫХ ДРЫВАМІ. ЗА ПЕРШУЮ ДЭКАДУ КАСТРЫЧНІКА ПАВІННА БЫЛО ПАСТУПІЦЬ ЗВЫШ 1.000 ВАГОНАЎ, ПАСТУПІЛА-Ж УСЯГА 318.

АДНА З АСНОЎНЫХ ПРЫЧЫН ДРЭННАГА ПАСТУПЛЕНЬНЯ ДРОЎ У МЕНСК — У ТЫМ, ШТО ЧЫГУНКА НЕ ДАЕ ВАГОНАЎ ПАД ПАГРУЗКУ.

У ВЫНІКУ ТАКІХ АДНОСІН ЧЫГУНКІ НА МЯСЦОХ ЁСЬЦЬ ЗАЛЕЖЫ ДРОЎ. ТАК, НА СТАНЦЫЯХ РАЁНАЎ, ЯКІЯ ПРЫМАЦАВАНЫ ДА МЕНСКУ, ЛЯЖЫЦЬ БОЛЬШ 700 ВАГОНАЎ ДРОЎ, ЯКІЯ ЧАКАЮЦЬ АДГРУЗКІ.

ЧЫГУНКА ПАВІННА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ ПАДАЧУ ВАГОНАЎ ДЛЯ АДГРУЗКІ ДРОЎ МЕНСКУ.

Чыгунка тармозіць адгрузку

ПЕТРЫКАЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 26-га КАСТРЫЧНІКА ЛЕСПРАМГАС ЗАПАТРАБАВАЎ ВАГОНАЎ ДЛЯ СТАНЦЫЙ: КАПЦЭВІЧЫ — 35, СТАРУШКІ — 3, ПТЫЧ — 7, МУЛЯРАЎКА — 5.

ПРАДСТАЎЛЕНА І ПАГРУЖАНА ЎСЯГО ТОЛЬКІ АДЗІН ВАГОН.

З ЗАГАТОЎЛЕНЫХ У БЕРАСЬНІ ДРОЎ ЛЯЖАЦЬ НА СТАНЦЫЯХ: КАПЦЭВІЧЫ — 4.100 РАЎМЭТРАЎ, СТАРУШКІ — 396, ПТЫЧ — 420 І МУЛЯРАЎКА — 250.

22 тысячы вагонаў дроў—гарадом БССР

На апошнім пасяджэньні СНК БССР было абгаворана пытаньне аб адгрузцы дроў для пралетарскіх цэнтраў. СНК прызнаў ход адгрузкі за апошнія месяцы нездавальняючым.

Для поўнага і своечасовага забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў палам, СНК вызначыў 36 лесправмагасаў, якім дана заданьне — вывезьці на працягу лістапада 22.000 вагонаў дроў для пралетарскіх цэнтраў.

За забесьпячэньне гарадоў палам ад казваюць наступныя лесправмагасы: Асіпавіцкі, Бабруйскі, Глускі, Клічаўскі, Парыцкі, Мазырскі, Пятрыкоўскі, Старобінскі, Жыткавіцкі, Каралінскі, Нараўлянскі, Рэчыцкі, Крупскі, Смалявіцкі, Касьцюковіцкі, Лепельскі, Любаньскі, Быхаўскі, Полацкі, Лёзьнянскі, Сіроцінскі, Сеньненскі, Віцебскі, Камарынскі, Барысаўскі, Гагачоўскі, Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Клімавіцкі, Магілеўскі, Шклоўскі, Аршанскі, Горацкі, Бялыніцкі і Чэрыкаўскі.

Грамадзкасьць гэтых раёнаў павінна мабілізаваць усе сілы на поўнае выкананьне плянаў.

СНК вызначыў таксама раёны, якія адказваюць за забесьпячэньне Менску дрывамі. Так, Асіпавіцкі раён павінен штодзенна адгружаць 57 вагонаў, Бабруйскі — 13, Глускі — 12, Клічаўскі — 7, Парыцкі — 7, Мазырскі — 13, Старобінскі — 12, Пятрыкоўскі — 17 і Жыткавіцкі — 7 вагонаў. Усяго за лістапад Менску павінна быць адгружана 4.300 вагонаў.

ЖЫВЁЛАЗАГАТОЎКІ

Жывёлазагатоўкі—важнейшы вучастак РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

Пакончыць з апартуністычным самацёкам, бюракратычным спакойствам і непаваротлівасьцю загатоўчых арганізацый, якія яшчэ не мабілізаваліся на бальшавіцкае правядзеньне загатовак жывёлы

Квартальны плян выканан толькі на 11, 2 проц.

Жывёлазагатоўчыя арганізацыі БССР фактычна яшчэ ня ўключыліся ў барацьбу за выкананьне пляну жывёлазагатовак за 4-ты квартал бягучага году. Частка раёнаў прыступіла да загатовак з недапушчальным спазьненьнем. Ёсьць раёны, якія дагэтуль яшчэ нават не давялі пляну жывёлазагатовак да сельсаветаў. Характэрным прыкладам зьяўляецца Дубровенскі раён, дзе ў загатоўчым апараце панує бюракратычны спакой, непаваротлівасьць, нежаданьне працаваць ударнымі тэмпамі. 17 кастрычніка Белкаапсаюз запытаў раённыя арганізацыі аб становішчы мясазагатовак. Аказваецца, што план загатовак на IV квартал і на 1932 год загруз у нэтрах плянавай часткі райвыканкому і дагэтуль яшчэ ня спуччан у сельсаветы. Гора-загатоўчыкі паведамілі, што «плян мясазагатовак на IV квартал 1931 году і на 1932 год знаходзіцца яшчэ ў плянавай частцы райвыканкому і да ізоўкі яшчэ не даведзен. Калі будзе спуччан — вестка будуць даны» і... супакоіліся.

Такая апартуністычная бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый па радзе раёнаў прывяла да зрыву выкананьня плянавага заданьня. На 20 кастрычніка квартальнае заданьне выканана толькі на 10 проц.

Амаль па ўсіх раёнах не наладжана пляновае паступленьне жывёлы. Часта на прыёмачных базах скапляецца вялікая колькасьць жывёлы і яе няма куды дзяваць. Так, з Касьцюковічаў тэлеграфуюць: «Сабралася жывёлы—авец 1500 штук, кароў — 200 штук, стаяць пад адкрытым небам, чыгунка не дае вагонаў».

Гэтая бясплянавасьць прыводзіць да ўпадку, зьнішэньня якасьці жывёлы, страты вагі. Прыёмачныя базы ў большасьці раёнаў не прыстасаваны належным чынам да хаваньня жывёлы. Кіруючыя раённыя арганізацыі не аддаюць належнай увагі набудове і адраманаваньню пунктаў.

Зусім дрэнна наладжан улік загатовак. У частцы раёнаў уліку паступленьня жывёлы ў сэктарыяльным разрэзе зусім не вядзецца. Гэта на руку кулацка-заможнай частцы, якая разбазарвае жывёлу, ігнаруе выкананьне цьвёрдых заданьняў. Загатоўчыя арганізацыі не даюць вестак аб ходзе загатовак. З 75 раёнаў толькі 50 дасылаюць весткі больш-менш рэгулярна, а астатнія з пяцідзённу. Ня ўсе раёны і пяцідзённу ўлік загатовак.

Вялікае значэньне ў загатоўках жывёлы адыгрывае камплектаваньне жывёлай калгасаў і саўгасаў. Між тым, гэта справа пастаўлена вельмі дрэнна. Загатоўчыя арганізацыі ў большасьці недаацэньваюць гэтай важнейшай задачы і ня прымаюць мер для выкананьня пляну камплектаваньня (Вабруйск і інш.). Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, на працягу кастрычніка павінна быць выканана 35 проц. квартальнага пляну жывёлазагатовак, выканана-ж толькі 11,2 проц. Сёнешнія тэмпы работы не забясьпечваюць ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦК і СНК. Даволі паказаць, што рад раёнаў на 20 кастрычніка не выканалі нават і 10 проц. пляну. Так, Аршанскі раён выканаў 8,6 проц. квартальнага заданьня, Бабруйскі—4,5 проц. Бялыніцкі — 5,9 проц., Вушацкі — 4,1 проц., Горацкі — 9,6 проц., Гарадоцкі—7 проц., Гомельскі — 7,3 проц., Крупскі 9,4 проц., Лепельскі — 7,1 проц., Магілеўскі — 5,7 проц., Менскі — 7,7 проц., Полацкі — 2,8 проц., Сурасскі—5,4 проц., Койданаўскі — 7,3 проц. і г. д.

Загатоўчыя і раённыя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, мабілізаваць іх на своечасовую здачу жывёлы дзяржаве. Трэба рашуча націскаць на кулацка-заможныя элементы, прымусіць іх выканаць цьвёрдыя заданьні. Руйнуючым апорам кулацтву і яго агентуры ў радах партыі, —на аснове шырокай масава-палітычнай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва трэба дабіцца рашучага пералому ў ходзе жывёлазагатоўчай кампаніі.

Ігнатковіч.

Кастрычніцкі плян сарваны

Магілёў. Магілёўскі раён — жывёлагадоўчы. Раё мае ўсе магчымасьці ня толькі поўнасьцю выканаць, але і перавыканаць плян жывёлазагатовак. Але загатоўчыя арганізацыі не мабілізавалі масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на выкананьне пляну загатовак, не разгарнулі масава-растлумачальнай работы аб значэньні своечасовай адгрузкі мяса пролетарскім цэнтрам.

Паводле пляну райспажыўсаюз павінен быў да 15 кастрычніка загатовіць ня менш 90 тон жывёлы. Паказаны тэрмін прайшоў, а плян не ажыцьцёўлен. Магілёўскі мясакамбінат павінен быў да 30 кастрычніка адгрузіць Ленінграду 90 тон жывёлы. Гэты плян таксама сарваны.

Па 20 кастрычніка паступіла толькі 20 штук буйной рагатай жывёлы з Чаўускага раёну і 25 — з Бялыніцкага. За загатоўчыя арганізацыі Магілёўшчыны спадзяюцца на самацёк і нічога ня робяць для арганізацыі мясазагатовак. Райспажыўсаюз і райкалгасаюз нават не распрацавалі пляну мясазагатовак, ня спусьцілі іх у ізоўкі, не мабілізавалі свае апараты на разгортваньне ўдарных тэмпаў работы. З 29 сельсаветаў Магілёўскага раёну загатоўчыя пункты арганізаваны толькі ў 4. Іншыя сельсаветы нават ня ведаюць, куды здаваць жывёлу; сельсаветы да пунктаў здачы не прымацаваны. У выніку загатоўкі жывёлы абязьлічаны, улік адсутнічае і арганізацыі ня ведаюць стаўшча на мясцох.

На 7 сельсаветах — Ахмоўскім, Вэндараўскім, Грабянеўскім, Рашкаўскім, Махаўскім і інш. цьвёрдыя заданьні па загатоўцы мяса да кулацка-заможных гаспадарак не даведзены. Гэтыя сельсаветы і парт'ячэйкі не аддаюць ніякай увагі загатоўкам жывёлы.

Трэба адначыць дрэннае кіраўніцтва жывёлазагатоўкамі і адгрузкай з боку Белмяса. Пляны загатовак на кастрычнік і ўвесь IV квартал атрыманы ў раёне толькі 6 кастрычніка. У папярэдніх дырэктывах аб падрыхтоўчай рабоце да мясазагатовак — шмат блытаніны і зьмен арыентовачных пляноў.

Трэба неадкладна узмацніць жывёлазагатоўкі па Магілеўшчыне, мабілізаваўшы вакол іх шырокія масы прапоўных. Трэба нагнаць прапушчанае, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну.

ПРАХАРЭНКА.

БУДАЎНІЦТВА ІЛЬНАЗАВОДАЎ

ЛЕКАМАБІЛІ—З ТАРФЯНЫХ БАЛОТ НА ІЛЬНАЗАВОДЫ

ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ БУДАЎНІЦТВА І МАНТАЖУ—МАКСЫМАЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ

Скарыстаць усе ўнутраныя рэсурсы

У апошнюю дэкаду—з 10 да 20 кастрычніка—тэмпы будаўніцтва ільназаводаў яшчэ больш зьнізіліся, асабліва па галоўных карпусох. Калі на працягу першай дэкады кастрычніка будаўніцтва галоўных карпусоў было выканана на 3 проц., дык за другую дэкаду толькі на 2 з пал. проц. Будаўніцтва заводаў па ўсёй БССР выканана на 71 проц., а па галоўных карпусох—на 78,5 проц. Процант зусім недавальняючы.

Будаўніцтва заводаў першай і другой чаргі таксама ня скончана. Усе тэрміны прайшлі. Ніякіх спасыланьняў на аб'ектыўныя прычыны быць ня можа. Частка будаўнічага матар'ялу (цьвікі) адпушчана. Неабходна максымальна скарыстоўваць усе мясцовыя рэсурсы. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны забясьпечыць сканчэньне будаўніцтва заводаў баявымі тэмпамі.

Мантажныя работы, устаноўка лёкамабіляў, разам са сканчэньнем будаўніцтва, павінны ісьці з максымальнай шпаркасьцю.

Між тым Белільнаканапляводбуд усё яшчэ ня скончыў перакідкі лёкамабіляй. І на 25-га кастрычніка 28 лёкамабіляў ня эрушаны з тарфяных балот. Толькі 13 лёкамабіляў знаходзяцца на ільназаводах. Злачыннае ігнараваньне дырэктыў партыйных і савецкіх органаў аб перакідцы лёкамабіляў павінна быць рашуча спынена. Рашуча ўдарыць па тых, хто не жадае выконваць катэгарычных дырэктыў аб неадкладным забесьпячэньні заводаў рухавікамі. Белільнаканапляводбуд і вучасткі нясуць непасрэдную адказнасьць за перакідку лёкамабіляў.

46 ільназаводаў павінны быць пушчаны ў гэтым годзе. Трэба прыняць усе меры, каб будаўніцтва было скончана ў бліжэйшы час.

Швінгтурбіну і трансьмісіі—у першую чаргу Боркавіцкаму ільназаводу

ДРЫСА. Будаўніцтва Боркавіцкага ільназаводу скончана. Лёкамабіль устаноўлен. Праведзены мантажныя работы.

18-га кастрычніка ў прысутнасьці рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў быў пушчан лёкамабіль.

Пуск заводу паводле пляну прызначан на 1-га кастрычніка. Тэрмін ўжо прайшоў. Усё гатова, але завод пусьціць нельга. Да гэтага часу няма швінгтурбіны і трансьмісіі.

Белільнаканапляводбуд павінен прыняць усе меры, каб Боркавіцкі ільназавод быў пушчан у бліжэйшы час. Ільнатраста, якая паступае з Боркавіцкага ільназодчага саўгасу і калгасаў, чакае машын для пераапрацоўкі.

КЛЯРОНАК.

Безгаспадарчасьць і абязьлічка

ЛЮБАНЬ. Сканчэньне пабудовы Любаньскага ільназаводу ідзе марудна. Тэрмін пуску заводу—1-га кастрычніка—прайшоў. Будаўніцтва заводу праведзена на 76 проц., а па галоўным корпусе—на 95 проц. Мантаж не пачынаўся. Машыны стаяць на двары і іржавеюць.

Хто адказвае за сканчэньне будаўніцтва і мантаж?—невядома. Панує поўная безгаспадарчасьць на заводзе, абязьлічка. Сярод рабочых і тэхнічнага персаналу разьвіваюцца дэмабілізацыйныя настроі.

На заводзе пачаліся загатоўкі трасты капапель. Траста здаецца сырая. Вільготнасьць дасягае 60 проц. Складачных памяшканьняў няма. Траста складваецца ў сьпірты, дзе яна можа згніць.

Канапляводны саўгас імя 10-цігодзьдзя БССР, стараецца хутчэй спіхнуць трасту на завод, не клапоцячыся аб яе якасьці. У саўгасе ёсьць тры памяшканьні, якія можна прыстасаваць для хаваньня трасты. Пенька-завод з саўгасам ніяк ня можа дагаварыцца аб гэтым. Затрацішы невялікія сродкі на рамонт гэтых памяшканьняў, можна захаваць трасту ад псаваньня.

Белільнаканапляводбуд і Белільнапенькатрэст павінны прыняць неадкладныя меры для хутчэйшага сканчэньня будаўніцтва заводу і захаваньня трасты капапель ад псаваньня.

Вінаватыя ў безгаспадарчасьці павінны атрымаць па заслугах.

Рыскін.

Вінаватых—да адказнасьці

ВЕТРЫНА. Неаднаразовыя сігналы друку аб злачынна-марудных тэмпах будаўніцтва Ветрынскага ільназаводу праходзіць міма ўвагі раённых арганізацый і кіраўніцтва Ветрынскага ільназаводу. Тэрмін пуску заводу прайшоў. Будаўніцтва скончана на 53 проц. У сучасны момант на заводзе працуе толькі 10 чалавек, а патрэбна 40.

Дырэктар заводу Кейш і дзесятнік Грынеевіч безадказна адносяцца да сваіх абавязкаў. Так, 19 кастрычніка рабочыя прышлі на работу ў 8 гадзін раніцы, а дзесятнік і дырэктар зьявіліся толькі ў 12 гадз. Чатыры гадзіны рабочыя сядзелі без работы. І гэта неаднаны прыклад.

Тэхнічны нагляд на заводзе адсутнічае. Шохі крыюцца так нядбайна, што праз шчыліны ў даху праходзіць дождж і сьнег.

Лёкамабіль для заводу дагэтуль не атрыман. Мэханік, які прыехаў для ўстаноўкі лёкамабіля, сядзіць без работы і атрымлівае зарплату. Ніякіх мер завод ня прымае для таго, каб перакінуць лёкамабіль.

На заводзе адсутнічае гаспадарчае вока. Ідзе прыёмка трасты. Для заводу прыбыла вага і яна ўжо другі месяц ляжыць на станцыі. І ў гэты-ж час дырэкцыя заводу ўзяла вагу ў каапэрацыі і за карыстаньне плаціць па 5 руб. у дзень.

Полацкія раённыя арганізацыі ведаюць аб гэтых злачынных паводзінах адміністрацыі заводу і ня прымаюць мер для ліквідацыі прарыву, для хутчэйшага сканчэньня пабудовы заводу.

Белільнаканапляводбуд і Полацкі райком партыі павінны прыняць неадкладныя меры для зьнішчэньня гэтых прарываў, прыцягваючы да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве важнейшага будаўніцтва.

ФЭЛЬДМАН.

Пад суд шкоднікаў!

ГАРАДОК. У Гарадоцкім раёне будуюцца тры ільназаводы. Тэмпы работы яўна неадавальняючыя.

Па Межыцкім ільназаводзе прыступілі да мантажу і толькі тады выявілі, што фундамант пабудован па-шкоднічку і што яго трэба перабудоўваць. Гэта значыць, што завод першай чаргі будзе гатоў толькі праз два месяцы. Вінаватых у шкодніцтве неабходна зараз-жа выявіць і прыцягнуць да самай суровай крымінальнай адказнасьці.

Па Гарадоцкім заводзе будаўніцтва вытворчага цэху закончаецца, але няма машын. Дрэнна ідзе будаўніцтва шох для хаваньня ільна-трасты.

Па ўсіх заводах загатоўка трасты пачалася. Значным тормазам у рабоце зьявуляецца адсутнасьць устаўдзеных стандартаў ільна-трасты. Апрача таго ільназаводы ня ведаюць, якія калгасы да іх прымацаваны, хто і колькі павінен здаць трасты.

Да вырабоўкі рабочай сілы для ільназаводаў не прыступілі!

Да пачатку новага парадку крэдытаваньня засталіся 3 дні

Абавязковыя ўмовы для атрыманьня банкаўскага крэдыту

Пастанова СПА ад 23 ліпеня г. г. аб надзяленьні дзяржаўных гаспадарчых органаў уласнымі зваротнымі сродкамі ў разьмерах, якія б забясьпечвалі іх мінімальныя нармальныя патрэбы, падымае на новую, вышэйшую ступень барацьбу за гаспадарчы разрахунак, як асноўны мэтад кіраўніцтва народнай гаспадаркай.

Прадпрыемства ставіцца ў новыя ўмовы. Яму даецца ўсё неабходнае для нармальнай работы, для выкананьня гаспадарчых плянаў.

Але і адказнасьць яго павышаецца. Прадпрыемства павінна пабудаваць сваю работу так, каб ня толькі не «праядаць» даных дзяржавай зваротных сродкаў, але і шляхам выкананьня плянаў накапленьня забясьпечыць рост сваіх зваротных сродкаў, а на гэтай базе і рост свайго прадпрыемства.

Надзяленьне гаспадарчых органаў уласнымі зваротнымі сродкамі ставіць па-новаму і пытаньні крэдыту.

Крэдыт становіцца сапраўднай зброяй у руках партыі і ўраду для ажыцьцяўленьня кантролю рублём.

Крэдыт мэтавы і зваротны дае рэальныя магчымасьці ажыцьцяўленьня кантролю рублём.

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу з усёй рашучасьцю ставіць перад гаспадарчымі органамі і крэдытнымі ўстановамі пытаньне аб выразным правядзеньні ў жыцьцё закону ад 23 ліпеня з 1 лістапада.

Важным мерапрыемствам у гэтым напрамку зьяўляецца своечасовы спуск да прадпрыемстваў і раённых аддзяленьняў Дзяржбанку крэдытных лімітаў.

Між тым, весткі сьведчаць аб тым, што рэспубліканскія прамысловыя аб'яднаньні і каапэрацыйныя цэнтры да гэтай адказнейшай задачы не гатовы.

Трэба зараз-жа прыняць усе неабходныя захады, каб забясьпечыць прадпрыемствам і інш. гаспадарчым органам в першых-жа дзён лістапада магчымасьць карыстацца банкаўскім крэдытам у меры фактычнага выкананьня сваіх плянаў загатовак, вытворчасьці і рэалізацыі.

Вяз гэтага рад гаспадарчых органаў будуць пастаўлены ва ўмовы, у якіх яны ня змогуць працаваць.

Што-ж трэба?

I. Своечасова спусьціць пляны

Аддзяленьні Дзяржбанку, атрымаўшы ліміт для таго ці іншага дзяржаўнага органу, могуць пачаць выдачу пазык толькі ў тым выпадку, калі клієнт падасьць банку зацьверджаны аб'яднаньнем фінплян на IV квартал і дырэктыўны балянс на 1 студзеня 1932 г.

Ліміт па гэтым пляне павінен адпавядаць ліміту, спушчанаму па лініі банку.

Адсюль практычная задача аб'яднаць пяў і каапэрацыйных цэнтраў—зараз-жа спусьціць сваёй пэрыфэрыі зацьверджаныя прыбыткова-выдатковыя пляны на чацьверты квартал і дырэктыўныя балянсы на 1 студзеня. Пры гэтым трэба памятаць, што ў дырэктыўных балянсах тыя тавара-матар'яльныя астачы, якія зьяўляюцца аб'ектам банкаўскага крэдыту, павінны быць асобна выдзелены.

II. Дагавары па рэалізацыі прадукцыі і тавараў

Адным з асноўных умоў укараненьня гаспадарчага разрахунку ў штодзенныя ўзаемаадносіны паміж дзяржаўнымі арганізацыямі зьяўляецца сыстэма дагавароў.

Крэдытная работа ў адпаведнасьці з законам ад 20-III і 23-VII пабудавана так, што арганізацыі, якія не падуць банку сваіх дагавароў з

ЗПАР ПланСкан А2В

КРАІНА БУДЗЕ ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

СТВОРЫМ ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА БАЛЬШАВІЗМУ

Міхась Чарот

Паэма пра Міколу Сініцына

Быў пастухом...
Мазыршчыны балоты
Ён мерыў лапцямі
Удоўж і папярок...
Ня раз пакрыўджаным
Ён начаваў пад плотам,
Любіў адно:
Палескай ночы змрок.

Сінь вышыні
І мігаценьне зораў,
Як многа дум
Навейвалі Мікопе...
Чуў ад людзей,
Што ёсьць Далёка горад,
Каб быць у ім—
Ня мерыў ён нікопі.

Такі ўжо лёс,
Як і бацьком,—батрачыць,
Перад багатымі
Гнуць сьпіну, біць паклон...
Але жыцьцё
Вірліць пашло інакш
І стараздаўшчыну
Забрала у палон.

Вайна—вайна!
Другой вайны пачатак.
У шаснаццаць год
Наш партызан Мікола
Чырвоным гнаў
Адкормны панскі статак...
Мазыршчына...
Лясы, балоты, поле...

Ён партызан
І бойкі і адважны,
Знаём яму
Тут кожны лог і кусьцік...
Вядзе атрад,—
Паспухае, прыпяжа...
А ворага—
Жывым ён не адпусьціць.

Мінулі дні—
Ён камандзір чырвоны,
Наган ў руках,
У нішэні партбілет...
Не страшна сьмерць,
Свабоду хто бароніць,
Будуе хто
Нязаны новы сьвет.

Два разы ранены
На калчаноўскім фронце,
Чырвоны сьцяг
У бойцы за Кранштадт...
Заўжды наперадзе
Быў у сваёй ён роце,—
Для рэвалюцыі
Надзейны быў салдат.

Франты прайшоў,
А сіла ўсё-ж ня гасьне,
У бойцы клясавай
Наносіць метка ўдар...
Ня так даўно
Спаткаў яго ў калгасе...
Ён старшыня—
Найлепшы гаспадар.

І сакратар
Калгаснае ячэйкі,
Якому фронт
Таксама сёньня сьніцца,
Гаворыць мне:

«Ты незнаём яшчэ з кім,
Вось старшыня
Таварыш наш — Сініцын!».

Ружовы твар,
Шрам тонкі над брывою,
А зірк вачэй
Наўкол маланкай скача...
Ціха сказаў:
— «І тут браць трэба з боем,
Каб найхутчэй

Расправіцца з кулаччам.
Здаецца ўсё
Наладжана ня дрэнна:
Машыны, трактары,
Калгаснікі—на яць!
А вораг ўсё-ж такі ня дрэмле,
Ня тут, дык там—
А зуб яго відаць.

На зьдзельшчыну
Калгас наш пераведзен...
Здаволены,
Аб гэтым што казаць,
Працуе кожны
Сілаю мядзьведзя...
На сходзе часам,
Здарыцца буза.

А хто бузіць?
Бывае і бяднота...
Дзіўлюся
Ў чым-жа тут прычына?
Глыбей зірнеш—
Кулацкая работа...
Ох, ёсьць ваўкі
Прыкрытыя аўчынай!

Люблю прастор,
Зялёную шыр поля
І працу дружную
Людзкога калектыву!..».
Пылае радасьцю
Ружовы твар Міколы,
І вдчуваецца
Як ён і тут шчасьлівы!

Мы змоўклі ўсе...
Над полем слаўся вечар...

Ды песьня звонкая
Чуваць была дзяўчыны...
А рэйкі звон,
Нібы калісь на веча,
Склікаў калгасьнікаў
Да хаты—на спачынак.

Калгасьніцы
Сустралі нас пя гаю,
Шчабечуць птушкамі:
— «Таварышок, Мікола,
Бач, зьдзельшчына
Сапраўды памагае,—
Працуюць усе.
І лепш і болей».

І звонкі сьмех,
І гутаркі і песьні,
Як-бы ня быў
І цяжкай працы дзень...
Мікола з гордасьцю
У шэрагах іх цесных,
Як камандарм
З пабедной бойкі йдзе.

А вечарам
Дае нарад на заўтра...
Ну, вось цяпер
Пара і для спачынку...
Дзе скарб калгасьнікаў—
Пастаўлена ўжо варта...
Мікола йдзе
Пазабаўляцца з сынам.
Чарнявы сын
Параскідае цацкі,
На рукі просіцца,—
Ну, і пашла гульня!
— «Глядзі, сынок,
Расьці на зьмену бацькі,
Лажыся спаць,
А мама палюлле!».
Аб справах зноў
Заўюцца думкі роем,
А сэрца стукае
Ўсяму жыцьцю у такт...
Вось прыклад вам
Калгасьніка героя,
Ён быў і ёсьць
Герой на ўсіх франтах.

25/X—31 г.

А. СЯНКЕВІЧ

На вышыню задач эпохі

Лёзунг — ЗА ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА БАЛЬШАВІЗМУ азначае, што мастацкая літаратура і мастацтва наогул павінны быць падняты на вышыню адпаведную новай вялікай эпохі будаўніцтва сацыялізму, што мастацтва павінна стаць МАГУТНАЙ ЗБРОЯЙ у руках пралетарыяту за сацыялістычную перабудову краіны.

Стаць АРГАНІЗАТАРАМ волі пралетарскіх мас, спрыяць далейшаму ўздыму творчага энтузіязму, сацспаборніцтва, ударніцтва, змагацца з буржуазнай спадчынай — рвацтвам, нядбайнымі адносінамі да вытворчасьці, безгаспадарчасьцю, узьнімаць масу на выкананьне ўказаньняў т. Сталіна—зробленых у яго прамове на нарадзе гаспадарнікаў — вось задачы, якія стаяць сёньня перад пралетарскай літаратурай і мастацтвам.

Выконваючы гэтыя задачы праз паказ новых камуністычных адносін да працы, праз паказ герояў пяцігодкі і працы ўдарных брыгад ў абстаноўцы клясавай барацьбы, у канкрэтнай абстаноўцы данага прадпрыемства, заводу, саўгасу — мастацкая літаратура зьявіцца МАГУТНЫМ СРОДКАМ ВЫХАВАНЬНЯ соцень тысяч новых пралетараў, якія з вёскі, калгасаў ідуць сёньня ў шахты, заводы, на Кузнецкбуды. Задачы пралетарскай мастацкай літаратуры далёка не абмяжоўваюцца рамкамі нашага Савецкага саюзу, — савецкая мастацкая літаратура становіцца СРОДКАМ ПРАПАГАНДЫ нашых дасягненьняў у капіталістычных краінах, яна НАТХНЯЕ пралетарскія масы капіталістычных краін у іх барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю.

Гэтыя вялізарныя задачы можа выканаць толькі літаратура, якая творыцца самой клясай-пераможцай — ПРАЛЕТАРСКАЯ ЛІТАРАТУРА.

Пралетарская літаратура стала ўжо буйным фактарам у нашым сацыялістычным будаўніцтве. І ў беларускай пралетарскай літаратуры, і ў літаратуры брацкіх савецкіх рэспублік мы ўжо маем ўзоры пралетарскага мастацтва. Мы маем ПАВАРОТ літаратуры і літаратараў тварам да вытворчасьці — дзесяткі пісьменьніцкіх брыгад працуюць на фабрыках, заводах, у калгасах. Фактам сусьветнага значэньня зьяўляецца заклік ударнікаў у літаратуру, паколькі гэты заклік, зьяўляючыся паказальнікамі вялізернага РОСТУ АКТЫЎНАСЬЦІ шырокіх рабочых мас, выражае сабою сацыялістычную тэндэнцыю да сьціраньня межаў паміж інтэлектуальнай і фізычнай працай.

Але побач з гэтым трэба канстатаваць яшчэ значнае АДСТАВАНЬНЕ пралетарскай літаратуры ад бурных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Мастацкая літаратура яшчэ НЕ разгарнула працы па лепшым мастацкім абслугоўваньні, патрэб рабочай клясы яшчэ НЕДАСТАТКОВА ўключылася ў барацьбу за выкананьне задач, пастаўленых т. Сталіным.

Гэтыя задачы датычаць непасрэдна і самой мастацкай літаратуры. Напрыклад, «АБЯЗЬЛІЧКА» яшчэ і дагэтуль пануе ў нашай беларускай пралетарскай літаратуры. Пісьменьнікі яшчэ не зразумелі, што лёзунг ліквідацыі абязьлічкі МАЕ непасрэдныя адносіны і да пралетарскай літаратуры. Беларуская пралетарская літаратура яшчэ ня выканала патрабаваньня свае клясы — даць ПАКАЗ ГЕРОЯЎ пяцігодкі, паказ работы ўдарных брыгад у канкрэтнай абстаноўцы, у абстаноўцы клясавай барацьбы на даным прадпрыемстве, заводзе, саўгасе.

Заклік ударнікаў у літаратуру арганічна ўвязан з лёзунгам паказу герояў сацыялістычнага будаўніцтва. Тав. Ліквідзінскі зусім правільна адзначае, што «НАШ ПАКАЗ ГЕРОЯЎ І ЗАКЛІК УДАРНІКАЎ ЁСЬЦЬ АДНАЧАСОВА І ПАКАЗ ГЕРОЯ І ЗАКЛІК УДАРНІКА. ГЭТА — АДЗІНАЕ ЗЬЯВІШЧА, ЯКОЕ ІДЗЕ ПАД АДНЫМ ЗНАКАМ, ЯКОЕ НІ Ў ЯКОЙ ІНШАЙ ЛІТАРАТУРЫ АПРОЧ ПРАЛЕТАРСКАЙ НЕ МАГЛО ЎЗЬНІКНУЦЬ».

І вось, калі мы запытаемся, ці здолелі мы, ва ўмовах БССР, выканаць задачы паказу герояў, паказу перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю новых форм камуністычнай працы праз творчасьць адказ. Наша дзяржаўнае выдавецтва выдала ўсяго толькі АДНУ кніжыцу двух ударнікаў. Яшчэ да гэтага часу мы не паклапаціліся, каб выйшаць хоць бы адзін зборнік твораў ударнікаў, якія прышлі ў літаратуру.

Партыя паставіла перад мастацкай літаратурай важнейшыя задачы — адлюстраваньне героікі грамадзянскай вайны, напісаньня гісторыі нашых фабрык і заводаў. Як мы спраўляемся з выразшэньнем гэтых задач? Трэба прызнацца, што ЗА ІХ ВЫРАШЭНЬНЕ МЫ ЯШЧЭ ЯК СЬЛЕД НЕ ЎЗЯЛІСЯ. На гэтым вучастку літаратуры мы маем вялізарны прарыў і за ліквідацыю гэтага прарыву мы павінны ўзяцца з такім-жа напорам, як гэта робяць лепшыя прадстаўнікі рабочай клясы на фабрыках і заводах.

Перад БелАПП'ам стаіць задача падняць на ВЫШЭЙШУЮ ступень працу з ударнікамі, што ідуць у літаратуру, дабіцца больш кваліфікаванай кансультацыі, дапамогі па лініі іх творчай працы, прыцягнуць ударнікаў у кіруючыя органы БелАПП'у і яе раённых сэкцый.

Ня менш адказная задача, пастаўленая перад БелАПП'ам і Беларускай Фэдэрацыяй аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў (БелФАСП) — гэта ПРАЦА З ПАПУТНІКАМІ І САЮЗЬНІКАМІ ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. «Папутніцтва на вынулым этапе выражала імкненьне дробна-буржуазнай інтэлігенцыі супрацоўнічаць з пралетарскай рэвалюцыяй, паколькі апошняя яшчэ не пачынала выкарчоўваць карэньняў капіталізму. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў рэканструкцыйны пэрыяд выклікае хістаньні значнай частні папутніцтва, што знайшло свае выражэньне ва ўзмацненьні рэакцыйных, буржуазна-кулацкіх тэндэнцый, якія выявіліся ў розных варыянтах у папярэднія гады» (з рэзалюцыі аб папутніцтве і саюзьніцтве апошняга пленуму РАПП). Ва ўмовах БССР гэты адыход частні папутнікаў набыў характар беларускага буржуазнага нацыянал-дэмакратызму і завёў паасобных пісьменьнікаў у стан контр-рэвалюцыі (Дубоўка, Пушча і інш.).

«У гэты-ж час абвастрэньне клясавай барацьбы ў літаратуры, якое прывяло да актывізацыі ўсіх буржуазных сіл апошняй, абумовіла працэс дыфэрэнцыяцыі ў дзярэдзьдзі папутніцтва і афармленьні яго левага, сапраўды рэвалюцыйнага крыла» (з рэзалюцыі пленуму РАПП).

Гэтую дыфэрэнцыяцыю мы маем і сярод папутнікаў у беларускай літаратуры. У той час, як асобныя пісьменьнікі, апынуўшыся ў палоне контр-рэвалюцыйнай нацыянал - дэмакратычнай ідэалёгіі, яшчэ і на сёньня канчаткова з ёю не парвалі, топчуцца на месцы, яшчэ ня здолелі зрабіць пераацэнку сваіх ранейшых нацыянал-дэмакратычных установак у мэтах адштурхваньня ад апошніх і набліжэньня да пазыцый савецкай літаратуры (Капыта. З яго аповесьці «Нядоля Заблоцкіх», М. Зарэцкі).

Рад пісьменьнікаў з «Узвышша» прызналі свае памылкі і ў сваёй творчасьці становяцца на пазыцыі саюзьнікаў пралетарскай літаратуры. Т.т. ГЛЕБКА, КРАПІВА, К. ЧОРНЫ далі крытыку раду нацыянал-дэмакратычных установак і папажэньняў у творчасьці былога «Узвышша». Яны рвуць «узвышэнскія» традыцыі і ў сваёй творчасьці. Апошнія творы, напрыклад, К. Чорнага паказваюць, што пісьменьнік стаў на шлях перамаганьня псыхалёгізму і біялёгізму, асабліва ў абмалваньні жыцьця вёскі. У намаганьнях такіх пісьменьнікаў, як К. Чорны, па выпрацоўцы марксыцкалянінскага сьветапогляду, па аўладаньні мэтадам дыялектычнага матэрыялізму трэба ўсімерна дапамагчы.

Некаторыя кроікі па набліжэньні да пазыцый саюзьніцкай літаратуры робіць Я. КОЛАС. Аб гэтым сьведчаць, напрыклад, апошнія творы Я. Коласа — «АДШЧАПЕНЕЦ», дзе робіцца спроба паказу калгаснага будаўніцтва на фоне разгорнутай клясавай барацьбы, яго паэма «НА ШЛЯХОХ ВОЛІ» і апошняя п'еса, напісаная аўтарам для пастаноўкі ў БДТ2, у якой Колас імкнецца паказаць перарастаньне імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Атштурхоўваючыя ад традыцый буржуазнага мінулага, пераключэньня на рэйкі рэвалюцыйнай савецкай літаратуры, не праходзіць гладка, бяз хістаньняў і зрываў. Шляхам пасьлядоўнай таварыскай крытыкі рэштак дробна-буржуазнай ідэалёгіі, індывідуалістычнай замкнутасьці і абмежаванасьці, рэштак перапавялічанага ўяўленьня аб ролі інтэлігенцыі і наогул цэлага традыцый мінулага, мы павінны дапамагаць пісьменьнікам, якія імкнуцца стаць у рады саюзьнікаў пралетарскай літаратуры.

Мы не павінны пакінуць без увагі самім сабе і тых пісьменьнікаў-папутнікаў, якія яшчэ працягваюць таптацца на месцы. Пераход частні папутнікаў у рады саюзьнікаў пралетарскай літаратуры не азначае бездакладнага адміраньня «патуніцтва». Тым больш, што ў рады папутнікаў прыходзяць маладыя пісьменьнікі—выхадцы з дробна-буржуазнага асяроддзя.

Сярод гэтай частні маладых папутнікаў існуе небясьпека рэцыдываў нацыяналістычных і буржуазных (кулацкіх) тэндэнцый, іменна якы «нядрэдка выступаюць у ролі эпігонаў горшых, найбольш рэакцыйных тэндэнцый прыгара крыла папутніцтва».

Творчасьць такога паэта, як АСТАПЕНКА, зьяўляецца асабліва паказальнай у гэтых адносінах.

«Перапрэньне пісьменьніка-папутніка ў пісьменьніка-саюзьніка азначае працэс ідэйнага пераўзбраеньня, аўладаньня сьветапогляду дыялектычнага матэрыялізму, асазнаньня і крытыкі сацыяльна-палітычнага сэнсу свайго папярэдняга творчага шляху, пераходу на ідэалёгічныя пазыцыі пралетарыяту, г. зн. у творчым пляне — выпрацоўка новага творчага мэтаду, якаснай зьмены стылявых асаблівасьцяй творчасьці, барацьбы за новы тып пісьменьніка».

Вось шлях для пісьменьніка-папутніка, паказаны рэзалюцыяй апошняга пленуму РАПП'у. Ня ўсе яшчэ папутнікі ідуць гэтым шляхам. Ёсьць такія, што сваю перабудову падмяняюць «ПРЫСТРОЙКАЙ», падладжваньнем пад сучаснасьць. Гэта пісьменьніні-халтурщычыкі, гэта ўсе тыя, хто замест сапраўдных савецкіх твораў даюць пралетарскаму чытачу «чырвоную» халтуру.

З ЛАКІРОЎШЧЫКАМІ І «ЧЫРВОНАЙ» ХАЛТУРАЙ НА ЛІТАРАТУРНЫМ ФРОНЦЕ ТРЭБА ВЕСЬЦІ БЕЗЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ.

Сярод задач, якія сёньня стаяць перад пралетарскімі пісьменьнікамі арганізацыямі, перад БелФАСП'ам, задача барацьбы з багамай і з горшым відам багемы — п'янствам зьяўляецца не апошняй. Трэба таксама стварыць усе неабходныя ўмовы для культурна-выхаваўчай працы сярод пісьменьнікаў. Трэба каб гаспадарчыя і савецкія арганізацыі выконвалі паказаньні ЦК КП(б)Б аб паляпшэньні бытавых умоў пісьменьніка.

Надыходзячая канфэрэнцыя МенАПП'у намеціць шляхі для вырашэньня перш за чарговых задач, якія стаяць перад пралетарскай літаратураю.

БелАПП і БелФАСП ПАВІНЧЫ ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ СВАЁЙ РАБОТЫ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ, ЯКІЯ ЁСЬЦЬ НА ЛІТАРАТУРНЫМ ФРОНЦЕ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ АД ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Цім. Зарэчны, С. Ліхадзіеўскі

ПЯТРО САВІЧ

ПАЭМА ПРА ГЕРОЙСТВА

1.

Шуміць у бурных паводках маладзіна Бяроза—дагэтуль спакойная, ціхая... Шуміць Бяроза — узмахамі пеністых хваль, трабінамі раскрышаных крыг, хрустам тросак і сьнегу.

На беразе Бярозы—адхоністым, заціканым ярусамі брусоў, дошак, дзябёлых камлёў—гудзіць і грымціць гігант лясной Беларусі: горда ўзьняты ўгору канвэер падае бярвеньні — звонкія, набраклыя пахучаю смалою, бярвеньні плывуць у вострыя зубы рам, адтуль — шалёўкамі, дылямі, апоркамі — у ярусы, на склады, у штабялі, каб укласьціся ў новы дом, у вежы на сілас; і ліжуць пажы краўы, і пеніцца жаўцізною шпона, і клеіцца, варыцца, сартуецца фанэра — альховая, дубовая,—сухая, абрэзаная, праштампованая стандартным надпісам — «Lesbel export»; фрэзэры вырозваюць даталі—ніжнікі, сярэднікі, верхнікі; шыпяць пажы шыпарэзаў, стукочуць малаткі збойшчыкаў, і аўтавагаэткі з задорам падхопліваюць бялныя, футаваныя дзьверы; і жывіць увесь гэты рух—токам і параю—электрасэрца камбінату; трубы выхаркваюць густы прагорклы дым, гудуць турбіны, пражорлівым качаргаркі глытаюць тоны піламіння і дрыўлянага друзу. Вымі сэрца, зьнімкыві яго—стане гігант мерыўвяком...

2.

І сэрца раптоўна стала:
Замёр гігант лясной Беларусі—застыў у нярухомасьці канвэер, спынілі бег лупільныя станкі, і фрэзэры раптоўна амоўклі.
Дзе? Што? Калі?
Хто? Чым? Як?
Гігант у апошні раз каўтнуў глыток студзёнае вады і ў апошняй канвульсіі адрыгануліся варштаты.
Забегалі людзі—устрывожаныя, спалоханыя, узрушаныя. Адзін аднаго закідвалі пытаньнямі і ў адказ адзін перад адным разводзілі ў замяшанасьці рукамі.
Дзе? Што? Калі?
Хто? Чым? Як?
Першай замерла турбіна. Кандэнсатар ня даў турбіне вады. Вады кандэнсатару не дала цыркуляцыйная труба. Значыць—труба першая атрымала ўдар.
Цыркуляцыйная труба — ад кандэнсатару турбін электрастанцыі крутым вылінам — пад кутом у 90°, праз глыбу зямлі, пераплеценую, зцэмэнтаваную стружкамі, трускамі, утрамбаваную і прыбітую, цераз помпавую станцыю, цераз дзьве запасныя студні — на глыбіні 10 мэтраў ад паверхні зямлі — урываецца ў стромкую плынь Бярозы, каб схахтаць, качаць, гнаць — з пякучаю смагай, са зьвярынаю прагнасьцю — крынічную студзёнасьць вады кандэнсатарам электрастанцыі.
Цяпер труба дзесьці прарвана, ня вытрымала бурнага напору вады,—труба млее ў глухім бясьсільлі. З гэтае прычыны і замёр гігант, і трубы качагарак ня выхаркваюць у неба густы прагорклы дым.
Тысячы рабочых рук спынілі работу, машыны адмовіліся ім падпачальвацца.
Спрабуй — адшукай балючую і шчымлівую рану цыркуляцыйнай трубы, дай ёй магчымасьць зноўку захліпацца новым напорам бурных вод Бярозы!
І людзі кінуліся капаць і разварочваць пераплеценую і зцэмэнтаваную глыбу зямлі, секчы яе рыллёўкамі, разьбіваць не пласты вострым і важкім ломам.
Дзе? Што? Як? Людзі ня ведалі і ведаць не маглі: даўжыня трубы — на сотню мэтраў: — Капаць?—Дзе?—Шукаць? —Што? — Ратаваць? — Як?—Але зямлю капалі, раскідвалі, разварочвалі.
Рыпалі дзьверы габінэту дырэктара, перазвоньваліся званкі тэлефонаў партколектыву і заўкому, і шанкі спецаўных інжынэраў і тэхнікаў зьбіваліся на патыліцу.
Над камбінатам вісела пагроза прастаяць два тыдні.
Два тыдні—сотні тысяч рублёў, два тыдні—павала прастояў і страт.
Капалі ад раніцы да глыбокае ночы. Грунт гразкае зямлі пластаваліся адна на адну, вырасталі ў паказмечаны трэбень валу.
Абконвалі трубу, і рацы трубы не знаходзілі. Зноў капалі, выкідвалі на паверхню пясок і суглінак. Грукацелі рыллёўкі, грымелі ламы, і кіркі ўгрызаліся ў грунт зямлі.
Вісела пагроза прастаяць два тыдні, страціць сотні тысяч рублёў.

3.

Камбінат стаяў другія суткі. Рабочыя па-ранейшаму прыходзілі ў свае дэхі, але, не знаходзячы работы, зьбіраліся групамі і абмяркоўвалі становішча.
Гадзіньнік электрастанцыі прабіў дванаццаць ночы.
У габінэт дырэктара прыйшоў маладжавы чалавек. Кінуў у непельніцу недакураную папяросу, агледзіўся. Маладжавы чалавек спакойна і проста выладжыў сваю думку, падаў сваю прапанову.
Дырэктар хмурыў бровы, марщчыніў лоб і катэгарычна не згаджаўся.
Чалавек настойваў на сваім. Яго прабавалі пераконваць і не пераконвалі.
Тэхнік з рэдзенькай бародкай і з шэвялюрай пад ёршыка далікатна ўзяўся танклявымі пальцамі левай рукі за гузік прамасьлянае капцулі маладжавага чалавека, правую рукою па-бацькаўску пахлопаў па яго плячы і лісьліва, ледзь прыкметна ўхмыляючыся, скрозь зубы праказаў:
... З агнём жарты, хлопча, малыш... Былі і мы некалі зялёнымі... Да чорта на ражок лезьлі... З агнём гуляеш, хлопча, кажу...
Маладжавы чалавек маўчаў. У габінэце гулка гаманілі, спрачаліся, даводзілі. Дырэктар нахінуўся галавою да тэхнічнага кіраўніка і штосьці яму на вуха пачаў гаманіць. Сэйс гутаркі раставаў у дыме пакою, чуліся толькі паасобныя словы:
— Небясьпечна... Можа рызыкаваць...
— Дыямэтр трубы толькі 35 сантыметраў...
— Асабліва на выгіне...
— Ні ў якім разе...
— Не дазваляць...
Дырэктар падняўся з крэсла, рыўком адсунуў у бок тэлефон, хмура праказаў:
— Адказваць за вынікі мы ня можам... Справа сур'ёзная... Трэба глыбока ўдумацца ў гэта...
Стары рабочы праціснуўся да стала і, размахваючы рукою, перабіў:
— А па-нашаму — сам бачыць. Спадзяецца на сябе — няхай робіць! Не стаяць-жа заводу!
Рабочы крута павярнуў ад стала, захінуўся крысамі спадоўкі і адышоў.
Сьціхлі галасы ў пакоі, людзі стаялі як бы бяз рухаў,—наступіла напружанае маўчаньне.

4.

За вокнамі стаяла ноч. Гадзіньнік электрастанцыі паказваў палову другой.
Маладжавы чалавек, скінуўшы верхнюю вопратку, абвязваўся жалезным тросам.
Каля кандэнсацыйнага баку стаяла невялікая група рабочых. Інжынэры некалькі раз аглядалі трайнікі, заглядвалі ў чорную зяпу патрубка, які вёў у цыркуляцыйную трубу—уніз, пад зямлю, у самую Бярозу.
Чалавек прымацоўваў да грудзей электрычны ліхтарык. За кожным яго рухам уважліва сачылі, прыглядаліся. З натугу пачуўся ня то жарт, ня то перасьцярога:
— Разьвітаўся-б з жонкай... Можа-б лягчай на сэрцы было...
Чалавек нічога на гэта не адказаў. Ён агледзеў самога сябе, зьмерыў дыямэтр трубы і спакойна спусьціўся ў неба. І калі чалавек прапоўз некалькі крокаў па трубе, ён пачуў галасы зьверху:
— Калі што якое, дык мы за трос... І зараз-жа па паверхні...
Плечы ў чалавека—дужыя, маладыя. Ім патрэбен прастор, ім патрэбна шыр. Вузкае жарало трубы цісьне, давіць маладыя плечы. Іржа цераз бялізну шчыпае скуру. Здаецца — на сьпіне бегаюць мурашкі, і ў локці колюць вострыя іголкі. Ажухлая вільгаць глухога сутарэньня асядае на лёгкія.
Чалавек, перамагаючы ажухласьць вільгаці і піск іржавых сьцен трубы, паўзе наперад, прабіваецца праз цемень і жудасьць.
На паверхні лічаць хвіліны, якія пачынаюць складацца ў цэлую гадзіну. Людзі, як бы адчуваючы нейкую віну, з нецярпіваньнем чакаюць звароту чалавека з-пад зямлі. Узрушаны інжынэр бяз усякае мэты бегае з месца на месца. Дзесяткі вачэй сочаць за рухам тросу: ён павольна разматваецца і зьнікае ў чорным жарале трубы.
Вочы гараць агнём спачуваньня і веры ў перамогу. З групы рабочых чуецца выкрык:
— Хлопцы, я лезу ў-след!.. Трэба падбадзёрыць...
Гэта голас качагара электрастанцыі Малорскага.
Чорнае жарало трубы глынае другую істоту.
А чалавек паўзе... У трубе холадна і зябка. Цела абліваецца ліпкім потам... Чалавек падпаўзае да выгіну трубы—самага небясьпечнага месца. Тут труба на 90° паварочвае ў бок, у напрамку да Бярозы. Цела чалавека — пругкае і дзябёлае — паварочваецца на бок і, на форме трубы, ломіцца ў пяясьніцы пад простым кутом. За выгінам труба становіцца больш прасторнай. Чалавек адчувае сябе вальней. Яму здаецца, што ён паўзе пад вямлёю ўжо цэлыя суткі. Пальцы, намацваючы дарогу наперад, качанеюць, як ў моцны мароз. Цьмянае сьвятло ліхтарыка асьвятляе гразь і сьлізоту трубы. Працятая іржою сарочка ліпне да цела.
І ўрэшце заморана зрок засьняіўся іскрамі цёплай радасьці: на трубе шчарылася шырачэзная шчыліна.

5.

Чалавек варочаўся назад. Выгін трубы сапраўды быў небясьпечны: абясьсіленаму целу шмат каштавала, каб яго абмінуць.
Спачатку толькі закружылася галава, цьмянае сьвятло ліхтарыка здалося рубіновым: міргае, хвалюецца ў шэрай пары вільготнасьці і сьлізотнай азызласьці, дрыжыць мутным бляскам у цемені трубы.
А потым па целе разьлілася мляўкая стомленасьць, здалося: цьвітуць сады — кветкамі, пярэстасьцю красак, і на пралінах сухой зямлі — пад бярозкамі, у кустох лазьняку — пралескі: сінія, што колер неба ў пагодлівы дзень... І шумы, і песьні навокал: ні то раўчак бурліць па каменчыках, ні то цокат капытоў каня па гарадзкім бруку, ні то звонкія гукі шарманкі на дварэ.

6.

У чорным жарыле трубы паказалася бясформеная, скамечаная істота. Вопратка была запацкана ў праз і іржу. Чалавек быў бяз прытомнасьці. Першым яго словам, калі яго адкачалі, было:
Ёсьць!
Больш ён нічога не сказаў. Грудзі яго захлыналіся ў сьвежым струмені паветра. Мускулы яго дрыжэлі, і ён стомленай рукою правёў па спацелым твары
. . . . . .
Два дні працягваліся работы па адналёньні цыркуляцыйнай трубы. Людзі разварочвалі сцэмэнтаваныя глыбі зямлі, секлі яе рыллёўкамі, разьбівалі пласты важкім ломам.
Урэшце цыркуляцыйная труба была заладжана. Кандэнсатар турбіны электрастанцыі зноўку глынуў сьцюдзёнай вады Бярозы. Запульсавала электрасэрце камбінату, і на алхоністым беразе Бярозы загуў і загрымеў гігант лясной Беларусі.
Маладжавы чалавек стаў героем Бабруйскага камбінату. Пра яго пісалі ў газэты:
«Камуніст Пятро Савіч сваім гераічным учынкам папярэдзіў прастой, які пагражаў камбінату, у выніку аварыі ў цыркуляцыйнай трубе. Пятро Савіч лепшы ўдарнік электрастанцыі, актыўны рабкор—зьяўляецца прыкладам бальшавіцкага энтузіязму на франтох сацыялістычнай рэканструкцыі. Рабочыя высока цэняць свайго героя і будуць раўняцца па ім у сваёй штодзённай рабоце і барацьбе.

1931 г.
Бабруйск—Менск.

ВЯЗЬМО IX-ае
Прадвялсеньні вечар. Адліга... Адкрыты сход камсамольскай ячэйкі. Апроч камсамольцаў прысутнічаюць старэйшыя рабочыя. Сярод іх Мер'ема. Стрэльбін—старшыня сходу.

Клім.

Насьпеў урачысты час,
Пара перамогі настала—
Глянуць, што зроблена ў нас,
Нашым ударным кварталам.
Заданьне было—900.
Тысячу—сустрэчнае слова,
На сёньня зрабіў завод
948.

Акуліна Карпаўна
З паловай!

Клім
Каб зьдзейсьніць сустрэчны план
Адна засталася дэкада.

Галасы
— Анавісьціць гураган!
— Што гураган,—кананаду!

Клім
Штурмам юнацкіх сіл,
Мы ўцягнем старэйшых, верна.
І разам, напорам усіх,
Тысячу вышлем у тэрмін.
Ня лёгка яно, але—вы,
Рабочым запальным прыбоем,
На сёньня з баёў штурмавых
З гонарам выйшлі—героі.
Давалася цяжка. Былі
І будуць яшчэ перашкоды.
Але ў барацьбе мы расьлі,
У агні бальшавіцкіх паходаў.
І тысячу, як адзін!
Навалаю—узяць барыкады!..
Вапчае слова — пачын
У штурме апошняй дэкады.

Чыж (У перабіўку з іншымі)
— Слова!

Андрэй Александровіч

НАСЬПЕЎ УРАЧЫСТЫ ЧАС...

(Урывак з п'есы „Напор")

— За!
— Абавязкова!
— Прапанова!
— Дай сказаць!

Стрэльбін
Па парадку, ня крычы.
Першым слова мае Чыж.
Да прэзыдыуму прабіраецца Мер'ема, гэтым самым перашкаджае гаварыць Чыжу і ў выніку яго перабівае

Чыж
Гураган — найлепшы ўродак,
Каб прарыў...

Мер'ема
Мае сынкі,
Каб заказ аддаць у час,
Трэба ўсім адным заходам
Стаць на працу, за станкі.
Ня дай божа гураганам,
Ён зьнішчыць усё, на завод.
І нашто, сынок каханы,
Зваць няшчасьце на завод?!
Лепш па-мойму, па-старому,
Працаваць, як сьвеціць сьвет...
Толькі ўцягнешся, да до-ому,
Заваркі гудок раве.
Хоць-бы так, гадзін дванаццаць;
Восем—што-ж гэта для нас?
А ў дванаццаць,
Добрай працай,
Можна выканаць заказ.
Згодна, сынку?

Базыль
Не, ня згода!
Наркампрац сказаў—заводы,
Маюць свой працоўны кодэкс.

Стрэльбін
Ніха, гады... Ў нас дэкада,
Прапаную ня крычаць!

Мішка
Верна, хлопцы, ціха... Даць
За дзесяць дзён павінны мы
Пяцьдзесят і два дамы.
Братва...

Акуліна Карпаўна (хутка)
Дайце слова,
Нам не 50 і 2,
А 51 з паловай...

Мішка
Братва, трывога! Ўдарыць моцна!
Сто—павінен даць завод.
Абязьсіліць на соты процант
Наш вытворчы штурм-паход.
Наш уздым—усіх рабочых—
Зазаве ў рашучы бой.
І трохзьмесна, дні і ночы,
Ні хвіліны на прастой,—
Плян ударны, наш, вытворчы,
Зьдзейсьнім працай штурмавой!

Галасы
— Верна!
— Правільна!
— Абгодай!

Стрэльбін (дыктуе сакратару)
І запішам так: Трывога,
Абвясьціць на ўвесь завод,
А таму наладзіць сход,
Наш вытворчы штурм-паход...
— Згода?

Галасы
— Ёсьць!
— Прарэдакціруй!

Стрэльбін
Значыць, хлопцы, толькі шчыра!
(глядзіць у блёк-нот)
А ў бягучых —слова мае,
Наш заўком таварыш Заяц.

Акуліна Карпаўна (Глядзіць на гадзіньнік)
Хай яшчэ зрабіць павінны
51 з паловай.
Вашым сёпешнім пачынам,
Лепш сказаўшы, пастановай—
Будзе сто, абавязкова!
На сваім чарговым сходзе,
Камітэт наш заваджі
Ухваліў узнагародзіць,
Запісаўшы пункт такі:
(Чытае вельмі хутка)

Слухалі: Аб прэміяваньні камсамольцаў за ўзорную працу.
Пастанавілі: Лічачы, што ў першым ударным квартале, атрымаўшы заданьне — выпуск дзевяці соцень стандартных дамоў для герояў сацыялістычнага Данбасу і, прымаючы пад увагу, што завод ня быў прыстасаваны, пры недахваце рабочай сілы, камсамольскія вытворчыя брыгады высунулі сустрэчны, абкруглёўны яго ў тысячу дамоў,—штурмавалі гэты плян, як сапраўдныя змагары за сацыялізм. Зроблена ўжо 945 (дадае ад сябе)... На сёньня 948 з паловай (чытае далей).
Гэта дасягнута на аснове правільнага кіраўніцтва партыйнага калектыву і на аснове ўжываньня камуністычных мэтадаў працы сацспаборніцтва, удар-ных брыгад для раздачы лепшым ударнікам ленінскага камсамолу нашага заводу. (Агульны ўздым).

Чыж
Во, красуй, мая качалка!

Галасы:
— Прэміроўка!
— Матацыкль!
— Прэміроўка — за штурмоўку!
— Гэта лоўка!
— Малайцы!

Стрэльбін
Па парадку... Хто там дурыць?
Падавай кандыдатуры.

Галасы (На перабой)
— Мішку!
— Мер'ему!
— Кірыл Антонавіча!
— Чыжа!
— Стрэльбіна!
— Васілісу! (сьмех)

Стрэльбін
Лепшым трэба, той—хто ўзор,
Хто камсамольскі браў напор,
Хто працаваў з агнём, як сьлед!
(Чытае сьпіс)
Мішку?

Галасы
— Даць!
— Матацыклет!

Базыль
Ён

Год выданьня—XV
№ 295 (4200)
Чацьвёр, 27 кастрычніка
Цана нумара 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І ПАДАРУНАК
Менск, Савецкая, 60.
Тэлефоны:
рэдактар—[illegible], сакратар—[illegible], сакратар—[illegible], прамысл.—[illegible], сан. аддз.—[illegible], маст. літ.—[illegible], інфарм.—[illegible], міжнародны інфармацыя—[illegible], канторы—[illegible]

Папярэднія вынікі выбараў у ангельскі парлямант

Разгром лейбарыстаў і перамога кансэрватар ў

ЗНАЧНЫ РОСТ УПЛЫВУ КАМПАРТЫІ

Большасьць былых лейбарысцкіх міністраў пацярпела паражэньне. Гендэрсон—ня выбраны дэпутатам.—Поўны правал „новай" (фашысцкай) партыі Мосьлі

ЛЁНДАН, 27. У выбарчых вучастках Лёндана, дзе выстаўлены камуністычныя кандыдатуры, рабочая маса з ВЯЛІЗАРНЫМ ЭНТУЗІЯЗМАМ ПАДТРЫМЛІВАЕ ВЫБАРЧУЮ БАРАЦЬБУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ. У гэтых раёнах на працягу апошняй ночы на бруку і сьценах былі напісаны мелам рэвалюцыйныя пёзунгі. Куты вуліц стракацяць лёзунгамі, накіраванымі супроць «нацыянальнага» ўраду і лейбарыстаў, і заклікаюць да барацьбы пад лёзунгам «класа супроць класы». Памяшканьні камітэтаў камуністычнай партыі напоўнены беспрацоўнымі, якія прапаноўваюць сваю дапамогу для правядзеньня выбарчай барацьбы. Рабочыя арганізуюць дзяжурствы пры ўваходзе ў выбарчыя вучасткі для агітацыі сярод выбаршчыкаў у карысьць кандыдатаў камуністычнай партыі. РАБОЧЫ РЫХТУЮЦЦА ДА МАСАВЫХ МІТЫНГАЎ і працасій да выбарчых вучасткаў, якія будуць прыцягваць выбаршчыкаў да арганізаванай падачы галасоў за камуністычных кандыдатаў.

ЛЁНДАН, 28. Паводле папярэдніх даных, лік галасоў, паданых за камуністычных кандыдатаў, узрос у радзе раёнаў, хаця аказаўся недастатковым для атрыманьня мандата.

ЛЁНДАН, 28. Парляманцкія выбары ў Англіі праходзяць пад знакам перамогі кансэрватараў і разгрому лейбарыстаў. Паводле вестак, якія ёсьць да гэтага часу, выбрана 222 кнасэрватары, 4 нацыянал-лейбарысты, 37 лібэралаў, у тым ліку 14 прыхільнікаў групы Саймона, 23 лейбарысты і 2 унепартыйных. Усяго прыхільнікаў ураду — 263. Кансэрватары выйгралі 101 месца, а лейбарысты згубілі 111, лібэралы выйгралі 13 і згубілі 2.

Большасьць былых лейбарысцкіх міністраў пацярпела паражэньне. Не абраным аказаліся Гендэрсон, Клайнс, Вондфільд, Грынвуд, Аляксандэр, Марысон, Томас Шоу і інш.

З вядомых палітычных дзеячоў ужо выбраны лібэрал Гэрбэрт Сэмюэль, нацыянал-лейбарыст Томас, лейбарыст Ленсбэры.

Мосьлі пацярпеў паражэньне. Лейбарысты згубілі месцы, якія лічыліся цьвярдынямі лейбарыстаў.

Першы выйгрыш лейбарыстаў зарэгістраваны ў Мэртыр Тыдфіле (Паўднёвы Уэльс), дзе супроць лейбарыстаў выступаў толькі кандыдат партыі Мосьлі. У Рэдынгу, дзе лейбарысты раней мелі большасьць 15.000 галасоў, на гэты раз за лейбарысцкага кандыдата было падана 4.000 галасоў, а лік галасоў, паданых за кансэрватараў, узрос да 12.000. У Бэрнлі, дзе балятыраваўся Гендэрсон, кансэрвацыйны дэпутат атрымаў 35.126 галасоў, Гендэрсон — 26.917 галасоў.

ЛІВЕРПУЛЬ, які ў мінулым парляманце быў прадстаўлены 6 кансэрватарамі і 5 лейбарыстамі, будзе цяпер прадстаўлены ў парлямант 10 кансэрватарамі і 1 лейбарыстам.

У Фінсбэры выбран Джылет. Гэта пакуль першы посьпех прыхільнікаў Макдональда, так званых нацыянал-лейбарыстаў.

ЛЁНДАН, 28. Буйны посьпех кансэрватараў перавысіў самыя сьмелыя чаканьні цьвёрдапобых. Умераныя кансэрватары спадзяваліся атрымаць невялікую абсалютную большасьць. Кансэрватары атрымалі большасьць у радзе прамысловых цэнтраў і ў радзе месц, якія заўсёды лічыліся цьвярдынямі Фрытрэдэрства (вольнага гандлю), як напрыклад, у Брэдфордзе.

Абмен сацыялістычным вопытам Менску і Масквы

Рашуча палепшыць дабрабыт рабочых акраін,

ВЫКАНАЦЬ НАКАЗ ВЫБАРШЧЫКАЎ АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЛІНІІ ТРАМВАЮ НА ЛЯХАЎКУ

АДКРЫТЫ ЛІСТ

рэдакцыям газэт „Зьвязда" і „Вечерняя Москва"

Нячуванымі тэмпамі будуецца новы Менск. Узбегі, пакрыўленыя халупкі, пынясьвяцюцца шматпавярховымі дамамі, якія дышуць шаладосьцю і здароўем. На месцы пустыроў і старадэўніх хатак вырасьлі магутныя карпусы фабрык і заводаў. Угару растуць паверхі Дому ўраду БССР, Дому Друку.

Горад расьце, павялічваецца і насельніцтва.

Да 1 студзеня 1931 году лік насельніцтва дасягнуў 153.000 чал. За гэты год гэты лік жыхароў павінен вырасьці яшчэ на 15.000 чал.

Трамвайны і аўтабусны рух у Менску не адпавядае тэмпам росту гораду. Некалькі год таму назад набудавалі трамвай. Пралажылі дзьве веткі. Адна лінія злучыла пасажырскі вакзал са Старажоўкай, другая — таварную станцыю з Барысаўскім трактам. А такія рабочыя раёны, дзе сканцэнтравана асноўная прамысловасьць Менску, як Ляхаўка і Серабранка, ня злучаны з цэнтрам. Усяго ў Менску на сёньняшні дзень ёсьць 20 трамвайных маторных вагонаў (прычэпных зусім няма). З іх пастаянна курсуюць ня больш 16 вагонаў. Рэшта—заўсёды ў рамонце.

За красавік 1930 году менскі трамвай перавёз 845.000 пасажыраў. У ліпені гэтага-ж году ён перавёз 1.230.000. У красавіку 1931 году лік перавезеных пасажыраў узрос да 1.170 тыс. чал. і ў ліпені—ужо да 1.805 тыс. чал. У апошнія месяцы трамвай перавозіць каля 2 мільёнаў пасажыраў у месяц. На трамвайных астаноўках заўсёды вялізарныя чаргі.

НК камунальнай гаспадаркі РСФСР абяцаў даць нам 10 вагонаў (6 маторных, 4 прычэпных) у першым квартале 1932 году, але ўжо цяпер відаць, што Мыціпчанскі завод заказу ў тэрмін ня выканае.

У чэрвені гэтага году мы павінны былі атрымаць цялежку з усімі дэталямі да трамвайнага вагону. У тэрмін мы цялежку не атрымалі. Расчаралі з заводам пераписку, але ён нас корміць абяцанкамі. Мне асабіста абяцалі прысылаць цялежку ў верасьні. Цяпер ужо канец кастрычніка, а цялежкі ўсё няма.

У наш транспарт уваходзяць яшчэ 23 аўтамашыны сыстэмы Штэер. З іх 18 выйшлі са строю з-за адсутнасьці запасных частак.

Ад «Аўтарамснабу» ўжо звыш двух год не атрымліваем запасных частак на 1 машыны. У выніку—магілкі з 18 аўтабусаў.

Зварачаліся ў Маскву, але здавальняючага адказу не атрымалі. Працуюць толькі 5 машын. Два аўтабусы абслугоўваюць рабочыя раёны—Серабранку і Ляхаўку. Тры—грузавыя машыны. Аўтабусы задавальняюць патрэбнасьць усяго на 3 проц., а грузавыя машыны—на 5 проц. Маса рабочых прымушана ходзіць пяшком на заводы.

Просім дабіцца ад Аўтарамснабу прысылкі нам неабходных частак да машын сыстэмы Штэер.

Просім НК камгасу РСФСР і Мыціпчанскі завод не затрымліваць выкананьня заказаў на трамвайныя вагоны для Менску.

Дырэктар транспарттрэсту
ГРАМЫКА.

Не дапусьціць зрыву перапісу камунальнай гаспадаркі

Паводле пастановы СНК БССР 20 кастрычніка павінен быў пачацца перапіс камунальнай гаспадаркі г. Менску. НК камунальнай гаспадаркі выпучыў 24 інструктароў па перапісу. Гарсавет павінен быў набрать 240 рэгістратараў, аднак, пакуль нічога ня зроблена.

Перапіс—важная палітычная кампанія. Ён дасьць матар'ялы для складаньня другой ляцігодкі разьвіцьця камунальнай гаспадаркі. Тэхнічны кіраўнік перапісу тав. БАЎДЗЕЙ, выпучаны гарсаветам, гэтага, як відаць, не разумее.

Зараз-жа трэба арганізаваць рабочыя брыгады па перапісу, стварыць на прадпрыемствах камісіі садзейнасьці. Навучальныя ўстановы павінны выпучыць патрэбную колькасьць рэгістратараў.

Сталіца БССР павінна даць найлепшы матар'ялы перапісу. Па прыкладзе Менску будуць раўняцца ўсе гарады БССР.

СЬЛІЦКІ.

Перад 14-ай гадавінай Кастрычніка

ЧЫГУНАЧНІКІ ШТУРМУЮЦЬ ПРАРЫВЫ

Выпуск паравозаў звыш пляну

Чыгуначнікі БССР узмоцнена рыхтуюцца да сустрэчы 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уся работа пра водзіцца пад лёзунгам правядзеньня ў жыцьцё загаду НКШЗ тав. Андрэева аб асеньня-зімовых перавозак і выкананьні ўсіх вымяральнікаў.

На чыгунцы абвешчан ударны месячнік штурму прарываў.

На Магілеўскім чыгуначным вузле 17-га кастрычніка быў арганізаваны суботнік па зборы мэталалому. Сабрана 15 тон. Да Кастрычніцкіх сьвят звыш пляну выпускаюцце два паравозы—адзін з абточкі і адзін з пярыядычнага рамонту. Ужо на сёньня Магілеўскае дэпо выпусьціла з халоднай прамыўкі звыш пляну адзін паравоз. 70 работнікаў дэпо выйшлі на ўборку гародніны ў прыгародныя калгасы.

Рабочыя Жлобінскага дэпо ўзялі на сябе абавязацельствы да Кастрычніцкіх сьвят адрамантаваць звыш пляну 2 паравозы і чатыры вагоны. 4-зьмены рабочых і служачых заключылі сацдагавары на выкананьне і перавыкананьне ўсіх вымяральнікаў.

На Аршанскім вузле камсамольцы адгрузілі тры эшалёны бульбы Ленінграду і стварылі спэцыяльную брыгаду па рамонце вагонаў.

Чыгуначнікі станцыі Негарэлае ўзялі на сябе 22 канкрэтных самаабавязацельствы: скараціць прастой вагонаў пад выгрузку і нагрузку да 3 з палавой гадзін, грузы для ўдарных пабудоў—Магнітабуду і Кузбасу—пасылаць без нефагрузчык, што дае 8 гадзін эканоміі і г. д.

230 НОВЫХ ШКОЛ

ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ У МЕНСКУ АДКРЫВАЕЦЦА СПЭЦЫЯЛЬНА ПАБУДАВАНЫ ДОМ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭКІ.

У РАЁНАХ ДА 14-ай ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА АДКРЫВАЕЦЦА 10 НАСТАЎНІЦКІХ КУРСАЎ, 2 ДАШКОЛЬНЫЯ ТЭХНІКУМЫ (ПОЛАЦАК І КРЫЧАЎ), КУРСЫ ПАЛІТАСЬВЕТЫ (ДРЫСА).

ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ 230 НОВАПАБУДАВАНЫХ ВЯСКОВЫХ ШКОЛ.

НК АСЬВЕТЫ ПРАВОДЗІЦЬ СЬВЯТА ПАД ЛЁЗУНГАМ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) АБ СЯРЭДНЯЙ І НІЖЭЙШАЙ ШКОЛЕ І ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У ШКОЛЬНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ. АБВЯШЧАЕЦЦА ДЭКАДНІК БАРАЦЬБЫ З НЯПІСЬМЕННАСЬЦЮ, ЗА СУЦЭЛЬНА-ПІСЬМЕННЫЯ ГАРАДЫ. ДЛЯ ПАДРЫСТОЎКІ ДА СЬВЯТА Ў РАЁНЫ ПАСЛАНЫ 60 ЧАЛ.

Конкурс на лепшы цэх і агрэгат

ВІЦЕБСК. НА ШВЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» ПРАВОДЗІЦЦА ПЕРАДСЬВЯТОЧНЫ КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЦЭХ І АГРЭГАТ.

УМОВЫ КОНКУРСУ НАСТУПНЫЯ: ДА СЬВЯТА ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ ЗА ТРЭЦІ КВАРТАЛ І ПЕРАВЫСЬЦІЦЬ ПЛЯНАВАЕ ЗАДАНЬНЕ ЗА КАСТРЫЧНІК; ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ПРАМФІНПЛЯНУ; ЯК МАГА ЛЕПШ РЭАЛІЗАВАЦЬ САЦДАГАВОР З ПРАНСКАЙ ФАБРЫКАЙ І ЗАХ. ПОВАСЬЦЮ. ЛІКВІДАВАЦЬ УСЕ ПРАГУЛЫ І СПАЗЬНЕНЬНІ БЕЗ УВАЖЛІВЫХ ПРЫЧЫН І Г. Д.

ПРАВОДЗІЦЦА КОНКУРС ТАКСАМА НА ЛЕПШУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ГАСПАДАРЧА - РАЗЬЛІКОВЫХ БРЫГАД, УКАРАНЕНЬНЕ ЗЬМЕННА - СУСТРЭЧНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАЎ, НА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ПА ЎБОРЦЫ ГАРОДНІНЫ І Г. Д.

ЛЕПШЫМ ЦЭХАМ І АГРЭГАТАМ БУДУЦЬ ВЫДАДЗЕНЫ З ПРЭМІІ: ПЕРАХОДНЫ СЬВЯГ ІМЯ ПАРТКОМУ І ЗАЎКОМУ. ПАРТРЭТ ТАВ. СТАЛІНА І ПРАМТАВАРЫ НА 500 РУБ.

Ударнай работай сустракаем сьвята

ВОРША, 27. (БЕЛТА). Рабочыя Аршаншчыны праводзяць шырокую падрыхтоўку да сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніка. Рабочыя заводу «Чырвоны барацьбіт» узялі на сябе абавязкі скончыць да сьвята капітальны рамонт чатырох трактараў і чатырох рухавікоў, зьменшыць брак ліцьця да 3 проц., сабраць увесь металялом, канчаткова ліквідаваць абязьлічку варштатаў і інструмантаў, перадаць у партыю Леніна лепшых ударнікаў.

Рабочыя заводу «Пралетары» абавязваюцца пусьціць два новых варштаты, якія замяняць ручную працу 20-ці рабочых.

Усебеларуская мастацкая выстаўка

7-га лістапада адкрываецца 4-я Усебеларуская мастацкая выстаўка, прысьвечаная 14й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

На выстаўцы будуць прадстаўлены ўсе віды выяўленчага мастацтва: маляўрства, скульптура, графіка, кіно-тэатральныя макеты, эскізы макетаў пастановак, вопратак і г. д.

Выстаўка будзе зьмяшчацца ў памяшканьні дому Працасьветы і клюбе навуковых работнікаў. Тэатральны аддзел гэтай выстаўкі арганізуецца ў памяшканьні Беларускага дзяржаўнага тэатру.

БелАПП рыхтуе гісторыю фабрык і заводаў БССР

Сакратарыят БелАПП'у пастанавіў: Усім асацыяцыям пралетарскіх пісьменьнікаў адразу-ж уключыцца ў рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) аб выданьні гісторыі заводаў, пачыць гэтую работу ўдарнай. Усім асацыяцыям і літаратурным гурткам БелАПП прапанавана спрапрацаваць гэта пытаньне на сходах і занятках. Да 1-га студзеня 1932 г. павінна быць падрыхтавана да выданьня серыі кніг па гісторыі фабрык і заводаў БССР.

Аб вывешваньні раздробных цэн у магазынах

Пастанова камітэту цэн пры Савеце Працы і Абароны

У мэтах забесьпячэньня кантролю спажыўцоў за станам цэн у магазынах наапэрацыі і дзяржаўнага гандлю і палягчэньня масавага кантролю ў барацьбе з адвольным павышэньнем цэн, — камітэт цэн пры СПА пастанаўляе:

1. Абавязаць усе гандлёвыя арганізацыі, пад асабістую адказнасьць загадчыкаў гандлёвымі прадпрыемствамі (магазыны, ларкі, кіёскі і г. д.), вывешваць на відным месцы прэйскуранты раздробных цэн.

2. За парушэньне гэтай пастановы загадчыкаў гандлёвымі прадпрыемствамі прыцягваць да крымінальнага суда.

Старшыня камітэту цэн пры СПА
МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар камітэту цэн пры СПА
ТЭР-ЕГІЯЗАРАН.
г. Масква, Крэмль.
27-га кастрычніка 1931 г.

На зьлётах менскіх ударнікаў

Абавязацельствы даны

Чыгуначнікі, мэталісты, швэйнікі, абутнікі, харчавікі далі ўрачыстыя абяцаньні: выканаць прамфінпляны 4 кварталу, ліквідаваць прарывы

Вынікі зьлётаў ударнікаў прапрацаваць у кожнай брыгадзе

Зьлёты ударнікаў менскіх прадпрыемстваў, што адбыліся ўчора, прайшлі пад знакам мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна, адозвы УсеЦСПС да справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК і выкананьня задач, якія стаяць перад кожным прадпрыемствам у чацьвертым квартале і напярэдадні 14-й гадавіны Кастрычніка.

Ударнікі вагона-рамонтнага заводу «Полымя рэвалюцыі» адзначылі, што за вод за апошні час працуе значна лепш. Выпуск прадукцыі расьце. Кузьнечны цэх выканаў праграму трэцяга кварталу на 120 проц., пасажырскі—на 113, мэханічны—на 94, і таварны—на 93. Але побач з гэтым ёсьць рад недахопаў: надзвычайна каштоўныя прапановы рабочых кавальскага цэху ня выконваюцца, павялічыліся выпадкі прагулаў і лятунства, у таварным цэху—кепская арганізацыя працы, таму цэх ня выконвае праграмы. І па іншых цэхах ёсьць выпадкі,—кажа ўдарніца тав. Кужца,—калі пасасобныя рабочыя і нават групы па цэлых гадзінах стаяць без работы.

Ударнікі заводу «Полымя рэвалюцыі» прынялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў: скараціць прастой вагонаў у рамонце да паўтара дзён, зьніжаць выдаткаваньне апалу на 10 проц., зьніжаць сабекошт на 10 проц., зьнішчыць выпадкі паўторнага рамонту вагонаў, да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі адрамантаваць 10 таварных і два пасажырскіх вагоны. Ударнікі т. т. Сакоціч, Понаў, Поэньян, Мінахоўскі, Баркун, Казлоўскі, Паўзун, Бардонскі, Субоцін, Жыгалка, Пятрова, Кобец, Вербіцкая, Яраш, Бортнік і іншыя прынялі на сябе рад абавязкаў па рамонце і ўборцы вагонаў.

На зьлёце ўдарнікаў цягі МББ чыгункі таварышы паказвалі на пяцігадкасьць кіраўніцтва работай з боку адміністрацыі, на непаваротлівасьць у задавальненьні розных матар'ялаў, ад чаго бываюць прастоі, на адсутнасьць уліку матар'ялаў і інш. За апошнія часы зьнізілася працоўная дысцыпліна, назіраюцца выпадкі прыходу на работу у п'яным выглядзе. Ударнікі таксама заазначылі аб кепскім становішчы задавальненьня з боку каапэрацыі. Гаспадарчы разрахунак укараняецца слаба, ня зусім ліквідавана абязьлічка.

На зьлёце ўдарнікаў заводаў імя Варашылава, «Камунар» і «Ударнік» дакладчык—дырэктар мэталяабъяднаньня тав. Сакаленка адзначыў, што праграма на радзе заводаў значна недавыканана. На заводзе «Ударнік» праграма за 9 месяцаў выканана на 62,5 проц., на заводзе «Камунар» на 74,6 проц., на заводзе імя Варашылава на 94,8 проц.

Ударнік тав. Шнэгель заявіў, што рабочыя «Камунара» слаба змагаюцца за павышэньне якасьці прадукцыі, не ліквідавана абязьлічка. Былі выпадкі, калі карштаты выходзілі са строю з прычыны адсутнасьці пастаяннага нагляду.

Лепш стаіць справа на заводзе імя Варашылава. Звыш 200 чал. пераведзены на прэмільна - прагрэсыўную зьдзельшчыну. Сьлесарны цэх, у сувязі з гэтым, павялічыў выпуск прадукцыі на 21 проц. На вечары старых рабочых, які быў прысьвечан перавыбарчай кампаніі ФЗМК, рабочыя падалі 120 рацыяналізатарскіх прапаноў.

Зьлёт мэталістаў прыняў на сябе рад абавязацельстваў для ліквідацыі прарываў.

Зьлёт ударнікаў Менскіх швэйных фабрык заслухаў даклад дырэктара швэйаб'яднаньня тав. Тэкліна, які адзначыў, што побач з выкананьнем прамфінпляну ў колькасных паказальніках, швэйныя фабрыкі адстаюць у выкананьні якасных паказальнікаў.

Ударнікі фабрык «Кастрычнік», «Першае мая» і інш. адзначылі, што віна за дрэнную якасьць прадукцыі падае ня толькі на рабочых, але і на адміністрацыю, якая ня вядзе амаль ніякай барацьбы з бракам.

На зьлёце ўдарнікаў гарбарна-абутковых і шчацінна-шчотачных прадпрыемстваў з дакладам выступіў нам. дырэктар тавара Белскураб'яднаньня. Праграма гатовай прадукцыі,—заявіў ён,—недавыканана на 10 проц. Лепш працуюць гарбарні. Напрыклад, гарбарня «Бальшавік» выканала праграму за 9 месяцаў на 107,7 проц. Замест адхіленьня ад першага гатунку на 6 проц., завод дабіўся адхіленьня толькі на 4 проц. Значна горш працуе абутковая фабрыка.

Ударнікі ўказалі на прычыны дрэннай работы абутковай фабрыкі. Цяхі толькі зараз пачынаюць пераводзіць на гаспадарчы разрахунак. Заробны цэх быў пераведзен на прэмільна-прагрэсыўную зьдзельшчыну без папярэдняга абгаварэньня сярод рабочых. У выдучэньні вядучых прафэсій рабочыя таксама на прынцыпі ўдзелу. Фабрычная арганізацыя не перанесьлі цэнтр свае работы ў пізнаяя зьвяньні. Абязьлічка на машынах, ураўнілаўка, неправільная расстаноўка рабочай сілы — усё гэта прыцяло фабрыку да буйных прарываў.

На зьлёце ўдарнікаў хлебазаводу, заводу «Беларусь» і фабрыкі «Камунарка» з дакладу прадстаўніка Наркамснабу выявілася, што фабрыка «Камунарка» выканала праграму за 9 месяцаў на 45 проц., завод «Беларусь»—на 78 проц., хлебазавод—па колькасных паказальніках—на 116 проц., а па якасных—на 45 проц. Асноўная прычына—ўраўнілаўка ў зарплаце і вялікая цякучасьць рабсілы. І на гэтым зьлёце ўдарнікі абяцалі прыняць усе меры да ліквідацыі прарываў.

Наогул усе зьлёты паказалі, што перадавікі-ўдарнікі з вялікім энтузіязмам адгукаюцца за выкананьне прамфінпляну і гатовы ўзмацніць сваю энергію для зьнішчэньня ўсіх недахопаў, якія стаяць на шляху поўнага выкананьня задач чацьвертага кварталу.

Аб выніках зьлётаў ударнікаў

Пастанова Прэзыдыуму Менгарпрафсавету

1. Канстатаваць, што зьлёты ударнікаў 27-га кастрычніка па асноўных галіцтва, прамысловасьці (машынабудаўнічая), і рэчы, ткацкая, швэйная, «Полымя рэвалюцыі», дэпо і інш.), давіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і прысьвечаныя абгаварэньню вынікаў і разьбарам ФЗМК—прэйшлі пы масабочых-ударнікаў.

2. Адзначыць, што зьлёты ўдарнікаў, дзякуючы разгортванню балышавіцкай самакрытыкі, выявілі прычыны прарываў і недахопаў у рабоце асобных прадпрыемстваў, дані рад практычных прапаноў рабочых-ударнікаў (дэпо, мэталісты) і выклікалі новы ўздым вытворчага энтузіязму ўдзельнікаў зьлётаў, узмацніўшы гэтым мабілізацыю мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач чацьвертага кварталу.

3. Асабліва падкрэсьліць здавальняючую падрыхтоўку да 1 зьлёту з боку ФЗМК машына-будаўнічай, скурана-абутковай і швэйнай прамысловасьці і заводу «Полымя рэвалюцыі», а таксама непасрэдны ўдзел у гэтых зьлётах ЦП саюзаў гэтых галін прамысловасьці.

4. Адначасова адзначыць, што з прычыны адсутнасьці належнай падрыхтоўкі з боку мясцкомаў і гарадзкога аддзяленьня саюзу каапэрацыйных работнікаў, Гаргрупкому і МК саюзу грамадзянскага харчаваньня, а таксама з прычыны слабога ўдзелу ЦП гэтых саюзаў—ня быў забясьпечаны ўдзел ударнікаў каапэрацыі і грамадзянскага харчаваньня ў зьлётах, чаму гэтыя зьлёты і былі сарваны.

Выходзячы з паказанага, лічыць неабходным:

а) Прапанаваць усім ФЗМК скарыстаць вынікі зьлётаў для далейшай мабілізацыі мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач, у трохдзённай тэрмін шырока прапрацаваўшы ў кожнай брыгадзе, групе і г. д. пастановы зьлётаў і практычныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне прамовы тав. СТАЛІНА і адозвы УсеЦСПС.

б) Гарадзкому аддзяленьню каапэрацыйных работнікаў і гаргрупкому грамадзянскага харчаваньня пастовіць на від за незабясьпячэньне арганізацыі зьлётаў і прапанаваць правесьці гэтыя зьлёты на працягу ТРОХ ДЗЁН.

в) Паведаміць ЦСПСВ аб слабым удзеле ў падрыхтоўцы да зьлётаў ЦП саюзаў грамадзянскага харчаваньня і каапэрацыйных работнікаў.

Аб зьніжэньні цэн на тавары камэрцыйных магазынаў

Пастанова камітэту цэн пры Савеце Працы і Абароны

Камітэт цэн пры Савеце Працы і Абароны пастанаўляе:

1. Зьнізіць цэны на тавары ў камэрцыйных магазынах у сярэднім на 30 проц.

2. Зацьвердзіць новыя прэйскуранты цэн тавараў у камэрцыйных магазынах па папярова-баваўняных тканінах, швэйных вырабах, абутку, трыкатажы, табачных вырабах, мыле гаспадарчым і туалетным, галёшах, рыба-таварах, фруктах, малочных таварах, мяса-прадуктах, рыбных кансэрвах, цукру, селядцох, якія прадугледжваюць сярэдні процант зьніжэньня цэн па групах тавараў у камэрцыйных магазынах у наступных разьмерах:

Папярова-баваўняныя тканіны — 30 проц., швэйныя вырабы — 31,5 проц., абутак — 32,6 проц., трыкатаж — 27 проц., табачныя вырабы — 23 проц., мыла гаспадарчае і туалетнае — 32 проц., галёшы — 31 проц., цукар — 15,6 проц., рыба-тавары — 27,3 проц., мяса-прадукты (каўбаса, капчоныя прадукты і мясныя кансэрвы) — 29,3 проц., малочныя тавары — 26,7 проц., рыбныя кансэрвы — 30 проц., фрукты — 28 проц.

3. Наркамснабу саюзу ССР увесь гандаць у камэрцыйных магазынах правесьці паводле новых прэйскурантных цэн. Прычым гэтыя цэны павінны быць вывешаны ў магазынах для ведамы пакупцоў.

4. Паказанае ў артыкуле першым зьніжэньне цэн правесьці ў жыцьцё з 1 лістапада 1931 г.

5. Устанавіць, што зьмяншэньне цэн у камэрцыйных магазынах можа праводзіцца толькі з дазволу камітэту цэн.

Старшыня камітэту цэн пры Савеце Працы і Абароны
Г. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар камітэту цэн пры Савеце Працы і Абароны
ТЭР-ЕГІЯЗАРАН.
г. Масква, Крэмль.
27 кастрычніка 1931 г.

Усім камуністам, якія жыпуць у дамах **б. ЖАКТ'у № 21,** прапануецца сёньня, 29 кастрычніка, у 7 гадз. веч. зьявіцца
на пасяджэньне фракцыі праўленьня
(Лінейны зав., канцылярыя ЖАКТ'у). Яка абавязкова і без спазьненьня.

„Чырвоная Зорка" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Да белай плямы Арктыкі
Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня — Мастацкі фільм Лявон Куцюр'е
„КУЛЬТУРА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы фільм ЛЕДАЛОМ. Звыш праграмы БАЯВЫ ФРОНТ
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — Я Е ШЛЯХ драма ў 6 част. ЗВЫШ ПРАГР. ПЕРШАЯ ДАПАМОГА
„Юны Піянэр" (бунтак кіно „Культура") — Арыгінальная камедыя ДЖОЙ и ДРУЖОК Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Каса адкрыта з 5 г. — Выдатны фільм Асобая Далёка-Усх. армія эпопея ў 7 частках

БРАГІНСКІ
малочна-жывёлагадоўчы тэхнікум
абвяшчае прыём
на 3-месячныя курсы
загадчыкаў малочна-таварных фэрм.
Прымаюцца на курсы ў першую чаргу заг. буйных МТФ, лепшыя ўдоўкі калгаснікі, што працуюць у галіне жывёлагадоўлі, па камандыроўках Райкалгасаюзу. Адукацыя павінна быць ня ніжэй 4-х груп сямігодкі.
Патрэбны дакуманты: 1) аб сав. становішчы, 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце, 4) аб адукацыі, 5) аб стане здароўя і 6) камандыроўка, пажадана водзывы.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Пачатак заняткаў 5 лістапада.
Пры тэхнікуме адкрыт прыём і на ЗАВОЧНЫ СЭКТАР па падрыхтоўцы майстраў, брыгадзіраў жывёлагадоўлі і малочнай прамысловасьці.
Дакуманты патрэбны: заява і анкета, засьведчаная с-с.
Адрас: Брагін, Малочна-жывёлагадоўчы тэхнікум.
Дырэкцыя.

Сэктар кадраў Белкааппрамсаюзу абвяшчае новы набор на **ўсебеларускія рахуннаводныя курсы прамкаапэрацыі** пры Бабруйскім Райпрамсаюзе.
На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 5 груп сямігодкі, узростам да 17 год. У першую чаргу прымаюцца члены прамарцеляй, прамкалгасаў і іх утрымэнцы, члены калгасаў і іх утрымэнцы і члены прафсаюзаў.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у суме 35 руб. у месяц і інтэрнымі 10 руб. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Да заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы: аб сацыяльным становішчы, аб праве голасу, пасьведчаньне аб адукацыі, аб узросьце, аб стане здароўя, рэкамэндацыю прамкаапэрацыйных, савецкіх і прафарганізацый, подпіску, што па скончэньні курсаў павінен працаваць у сыстэме прамкаапэрацыі па паказаньні Белкаапрамсаюзу ня менш 2 год.
Заявы накіроўваць па адрасе: БАБРУЙСК, РАЙПРАМСАЮЗ, КАМСАМОЛЬСКАЯ, 29.
Заявы будуць прымацца да 10 лістапада 1931 г.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ Малакакалгасцэнтру
— АБВЯШЧАЕ —
працяг набору на 1-шы курс ва ўноў адкрываемы
РАСЬНЯНСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
Тэрмін навучаньня 2 з палав. г.
Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годкі або малочныя падрыхтоўку ў аб'еме 7-годкі. Могуць быць прынятыя асобы з ведамі ніжэй 7 годкі, якія маюць практычны стаж працы па ветэрынарыі.
Дакументы, згодна даведніку НКП, як і для іншых тэхнікумаў.
Залічаныя ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.
Працяг набору **да 5-га лістапада.**
Заявы накіроўваць: **м. Расна, Мсьціслаўскага раёну, Ветэтэхнікуму.**

ЖАКТ № 7 паведамляе, што **сёньня,** 29 кастрычніка, роўна ў 7 гадз. веч., у клюбе Гарсавету (Пляц Волі)
адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ЖЫХАРОЎ
ЖАКТ'аў №№ 7, 9 і 11 (б. № 7).
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Аб разбуйненьні ЖАКТ'аў (дакл. т. Мерсон).
2) Аб санмінімуме (дакл. сан д-р Дукорскі).
Пасьля сходу—кіно.
Яка ўсіх жыхароў абавязкова.
Праўленьне.

СЁНЬНЯ, 29 кастрычніка, у 7 гадз. веч., скліча**ецца**
пасяджэньне новаабранага ЦБ навуковых работнікаў,
у памяшканьне клюбу СНР (Камуністычная, 17-а
Запрашаюцца: Данільчык, Бальфсон, Панневіч, Робінаў, Чарвякоў, Крывіцкі, Ра оун, Май, Гусеве, Малочка, Рудзіцін, Зюсьнаў і Духовуч.
У 6 з пал. гадз. веч.—**пасяджэньне фракцыі ЦБ СКР.**

„БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЕ"
даводзіць да ведамы ўсіх сваіх камітэтаў,
што на падставе загаду НКШЗ ад 13-VIII—31 г. у разнарадках на адгрузку сродкаў с.-г. вытворчасьці **павінны дакладна паказвацца:**
1) Станцыя прызначэньня грузу і назва чыгункі.
2) Поўная назва грузаатрымальніка.
3) Дакладны адрас грузаатрымальніка (у гарадох—назва вуліцы, № дому і № тэлефону, калі такі ёсьць; у сельскіх насэлаваньнях — назва раёну, сельсавету, вёскі і бліжэйшага паштовага аддзяленьня).
4) Поўная назва плятніка.
5) Дакладны адрас плятніка як у п. 3).
6) Назва філіялу дзярж